ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



Студэнцтва... «на пробу»



Дарога ў «Магадан»



Паветраныя бомбы Атлантыкі

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**8,6 млн гектараў —**

*такую плошчу займаюць у Беларусі сельскагаспадарчыя землі (гэта амаль 41% агульнай тэрыторыі), у тым ліку ворныя — 5,7 млн га, або 27%. У сельскай гаспадарцы краіны занята каля 8% ад агульнай колькасці працуючых у эканоміцы, вырабляецца 7% валавога ўнутранага прадукту. За апошнія 5 гадоў аб'ём вытворчасці сельгаспрадукцыі ў гаспадарках усіх катэгорый павялічыўся на 8,8%, у тым ліку прадукцыі раслінаводства — на 5,2%, жывёлагадоўлі — на 10,2%. Асноўны ўклад у вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі ўносяць сельскагаспадарчыя арганізацыі і сялянскія (фермерскія) гаспадаркі, на долю якіх прыпадае больш за 79% прадукцыі сельскай гаспадаркі.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 5° |
| Віцебск | 0° |
| Гомель | 0° |
| Гродна | + 5° |
| Магілёў | + 1° |
| Мінск | + 1° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.11.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9498 | ▼ |
| Еўра | 2,0892 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0301 | ▲ |
| Укр. грыўня | 0,0738 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X
16222
9 771990 763008

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ЛІСТАПАДА 2016 г. ЧАЦВЕР № 222 (28332)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

■ Нашы ў космасе

# КАМАНДЗІРОЎКА НА АРБІТУ

**Сёння наш зямляк, касманаўт Алег Навіцкі, другі раз адпраўляецца ў космас. А народны мастак Беларусі Іван Міско завяршае работу над двухбаковай памятнай плакеткай, якая наўздагон касмічнаму караблю трапіць на арбіту ў грузавым адсеку**



Фота Надзеі БУЖАН.

**Па задуме скульптара, у космасе кожны з экіпажа пакіне на памятнай плакетцы свой аўтограф.**

**Карэспандэнты «Звязды» пабывалі ў майстэрні-музеі скульптара і першымі ацанілі касмічны «груз».**

На плакетцы адлюстраваны партрэты трох чалавек: Алега Навіцкага, французскага астранаўта Тама Песке і амерыканскай астранаўткі Пегі Уітсан. Менавіта такі экіпаж касмічнага карабля «Саюз МС-03», які ўзначаліў наш зямляк. Гэта ўжо другая камандзіроўка беларуса на арбіту. Першы палёт адбыўся ў кастрычніку 2012 года. Тады Алег Навіцкі быў камандзірам карабля «Саюз ТМА-06М».

## З трэцяй спробы

На зваротным баку памятнай плакеткі — фрагмент зямнога шара і касмічная станцыя. Як яна выглядае, Іван Міско ведае не па чутках. Фотаздымак станцыі, зроблены Алегам Навіцкім падчас свайго першага палёту на арбіту, знаходзіцца на самым бачным месцы ў майстэрні скульптара. Аб асобе аўтара сведчыць аўтограф.

Менавіта свой подпіс, па задуме Івана Міско, кожны касманаўт, адлюстраваны на памятнай плакетцы, павінен будзе пакінуць на ёй. Прычым у космасе.

СТАР. 3

■ Падпіска-2017

## РУШЫМ У ШЧУЧЫН!

Звяздоўцы працягваюць ладзіць свае традыцыйныя сустрэчы з чытачамі ў розных мясцінах Беларусі. Падчас такога восеньскага «тура» мы ўжо завіталі ў Мінскі, Карэліцкі і Слуцкі раёны, а таксама адзначылі лепшых падпісчыкаў у Савецкім раёне сталіцы. Як бачым, геаграфія маршруту даволі разнастайная, і яна надалей будзе толькі пашырацца. Бо нам цікава і мясціны розныя пабачыць, і, канешне ж, сустрэцца з душэўнымі людзьмі. Спадзяемся, што гэта ўзаемна і нашым чытачам таксама будзе даспадобы.

Заўтра мы рушым на Гродзеншчыну — у Шчучынскі раён. Адметныя мясціны, цудоўныя людзі, таму, думаем, усё павінна атрымацца як мае быць. Такім чынам, **18 лістапада з 11 да 14 гадзін Дзень падпісчыка газеты «Звязда» адбудзецца ў Шчучынскім раённым вузле паштовай сувязі**. Да сустрэчы!

■ Проза жыцця

# ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР,

## або Як папярэдзіць няшчасныя выпадкі

**Чалавеку, як біялагічнаму тыпу, ад прыроды ўласцівы інстынкт самазахавання. Але, на жаль, некаторыя страчваюць гэтае пачуццё і як вынік — гінуць. Не толькі на вытворчасці. Ад пажараў, атручэння алкаголем, суіцыдаў, ужывання наркотыкаў, у дарожна-транспартных здарэннях, на рэках і азёрах. За кожным выпадкам стаяць трагедыі канкрэтных сем'яў. Нехта страціў адзінага сына, іншы — каханага мужа, любімых брата або сястру. Аб тым, што робіцца, каб пазбегнуць няшчасных выпадкаў, ішла размова на пасяджэнні Мінаблвыканкама па выкананні патрабаванняў Дырэктывы Прэзідэнта №1.**

Па словах **старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама Алега СЕМЯНЧУКА**, у цэнтральным рэгіёне за апошнія пяць гадоў гібель людзей ад знешніх прычын зменшылася больш як у 1,7 раза. У 2010-м загінула 2613 чалавек. У 2015 годзе — 1533. Колькасць загінулых у выніку няшчасных выпадкаў на вытворчасці ў мінулым годзе зменшылася на 23,5% — з 34 да 26 чалавек.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

## Сёння — прэс-канферэнцыя Прэзідэнта

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сёння правядзе прэс-канферэнцыю для прадстаўнікоў расійскіх рэгіянальных сродкаў масавай інфармацыі — удзельнікаў традыцыйнага прэс-тура ў Беларусь, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Мерапрыемства праводзіцца ўжо трынаццаты раз. У цяперашняй прэс-канферэнцыі прымуць удзел амаль 100 прадстаўнікоў СМІ і блогасферы з 46 рэгіёнаў Расіі.

Напярэдадні прэс-канферэнцыі праходзіць традыцыйны прэс-тур. Гэтым разам расійскія журналісты знаёмяцца з сацыяльна-эканамічным развіццём Магілёўскай вобласці.

Плануецца, што прамая трансляцыя прэс-канферэнцыі пачнецца ў 10.00 на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё. Тэлевізійную версію прэс-канферэнцыі пакажуць у вячэрнім эфіры тэлеканалаў «Беларусь 1», «Беларусь 24», АНТ і СТБ.

## АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ

Набіраць па суботах нумар тэлефона гарадской, раённай ці абласной адміністрацыі — ужо традыцыя. Прамыя лініі дапамагаюць хутка, а галоўнае — эфектыўна рэагаваць на праблемы. 19 лістапада чыноўнікі ў розных кутках Беларусі зноў выйдуць на сувязь з народам. Колькасць зваротаў становіцца ўсё меншай, ды і праблемы грамадзян імкнуцца вырашаць, што называецца, па гарачых слядах.

**19 лістапада з 9.00 да 12.00 на тэлефонныя званкі адкажуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні ВЯЛІЧКА Алег Іванавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні АСКЕРКА Віктар Вітальевіч (80212222222);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПРЫВАЛАЎ Уладзімір Аляксандравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЛІСКОВІЧ Віктар Андрэевіч (80152735644);

**Магілёўскі аблвыканкам**
старшыня ДАМАНЕЎСКІ Уладзімір Віктаравіч (80222501869);

**Мінскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні КАРПЕНКА Ігар Васільевіч (80172224444).

■ Парламенцкі дзённік

# РАБОТА З СУСВЕТНЫМ БАНКАМ АКТЫВІЗАВАЛАСЯ

## Міхаіл Мясніковіч прапанаваў рэалізаваць праект па электрамабілях

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ сустрэўся з дырэктарам аддзела Беларусі, Малдовы і Украіны Сату Хрысцінай Кахконен і кіраўніком Прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Ян Чул Кімам.**

Спікер верхняй палаты беларускага парламента звярнуў увагу, што дзейнасць групы Сусветнага банка ў Беларусі актывізавалася. «Хацелася б замацаваць гэтыя станоўчыя тэндэнцыі і забяспечыць іх далейшае развіццё», — выказаў пажаданне парламентарый. У сувязі з гэтым старшыня Савета Рэспублікі агучыў некалькі прапаноў па інвестыцыйных праектах, якія рэалізуюцца ў Беларусі пры падтрымцы Сусветнага банка. «Было б вельмі цікава, калі б мы маглі разгледзець новыя глабальныя інавацыйныя агульнасістэмныя праекты, галіновыя і міжгаліновыя, якія можна было б паспяхова рэалізаваць з удзелам Сусветнага банка», — прапанаваў Міхаіл Мясніковіч. У якасці прыкладу ён прывёў праект Банка і Беларусі ў сферы лясной гаспадаркі.

Міхаіл Мясніковіч прапанаваў прадстаўнікам Сусветнага банка падумаць над праектам, які ўключаў бы ў сябе шэраг інавацый па электрамабілях. «Электрамабілі, сучасныя заправачныя станцыі, акумулятары і цэлы шэраг іншых пытанняў», — удакладніў ён. Рэалізацыя такога праекта ў Беларусі будзе мэтазгодней дзякуючы транзітнаму патэнцыялу нашай краіны. Акрамя таго, беларускі бок дастаткова прасунуўся ў такой галіне, як вытворчасць гібрыдных аўтобусаў, тралейбусаў, трамваяў. «Ёсць зачын і спецыялісты, якія ўмеюць гэтую працу выконваць», — падкрэсліў спікер верхняй палаты парламента.

У той жа час Беларусь з уводам у эксплуатацыю сваёй атамнай станцыі будзе мець пэўны прафіцыт электраэнергіі, асабліва ў начны час. «І гэта таксама можна было б эфектыўна выкарыстоўваць для акумулятарных і зарадных станцый», — дадаў Міхаіл Мясніковіч. Старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што прапанаваны ім праект можна назваць праектам будучага, паколькі ўжо ў даволі хуткім часе колькасць транспартных сродкаў на электрычнай цязе можа істотна вырасці.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Медыцына

# Кваліфікаваная дапамога стала бліжэй

## У Брэсце адкрылі інфекцыйныя карпусы абласной бальніцы

**Гэта стала доўгачаканай падзеяй у абласным цэнтры, дзе няма асобных гарадской альбо абласной інфекцыйнай бальніц. «Тры абноўленыя корпусы абласной бальніцы цяпер можна назваць паўнацэннай інфекцыйнай бальніцай», — сказаў у прывітальнай прамове міністр аховы здароўя краіны Васіль ЖАРКО.**

А **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС** падкрэсліў асаблівую важнасць аб'екта ў памежным горадзе. У нас па-ранейшаму актуальная праблема завозу на тэрыторыю трапічных інфекцый, такіх як малярыя альбо ліхаманка. Паводле слоў губернатара, сёлета брэсцкія медыкі сутыкнуліся з выпадкам успышкі адру, які завезлі да нас прадстаўнікі каўказскага рэгіёна. У гэтай сітуацыі вельмі важна мець сучасную клініку, здольную супрацьстаяць любой інфекцыі.



Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

І яшчэ важней, каб нашы дарослыя і дзеці з абласнога цэнтра, вёсак і райцэнтраў маглі заўсёды атрымаць кваліфікаваную дапамогу. Для гэтага і было праведзена маштабнае будаўніцтва, якое афіцыйна называецца рэканструкцыяй. Кошт аб'екта ацэнены ў 227 мільярдаў недэнамінаваных рублёў. З іх 44 мільярды затрачаны на закупку тэхналагічнага і медыцынскага абсталявання.

Інфекцыйны стацыянар разлічаны на 120 ложкаў. Несумненна, ён дазволіць павысіць якасць аказання дапамогі пацыентам з інфекцыйнымі захворваннямі, а таксама палепшыць умовы для работы медыцынскага персаналу.

У сваім віншавальным слове з нагоды адкрыцця важнай установы **кіраўнік вобласці Анатоль ЛІС** пажадаў усім будучым пацыентам бальніцы выпісвацца з заключэннем медыкаў «здаровы».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Тры пытанні да ўлады

# Культура павінна быць ва ўсім

## У Карэліцкім раёне няма стратных прадпрыемстваў, скарочаных працоўных тыдняў і запазычанасцяў

**Летапісная гісторыя гэтых мясцін вызначаецца шасцю стагоддзямі (першая згадка аб Карэлічах адносіцца да 1395 года). Летась Карэліцкі раён адсвяткаваў 75-годдзе. Багатая гэтая зямля і культурнай спадчынай. Мноства таленавітых і вядомых людзей родам адсюль: пісьменнікі Янка Брыль, Ян Чачот, «беларускі шаляпін» спявак Пётр Конюх, мастак Валянцін Мірановіч. А Мірскі замак застаецца візіткай не толькі Карэліччыны, але і ўсёй Беларусі. Як жывецца і працуецца людзям у гэтым самабытным краі, карэспандэнт «Звязды» пацікавілася ў старшыні Карэліцкага райвыканкама Віктара ШАЙБАКА.**

***— Віктар Леанідавіч, наяўнасць у раёне такога знакавага аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны, як Мірскі замак, несумненна, добрая падстава для развіцця турызму і рамёстваў, для актыўнага культурнага жыцця...***

— Калі мы гаворым пра культуру ў раёне, то маем на ўвазе не толькі Мірскі замак, але і навакольныя тэрыторыі: 162 населеныя пункты, 13 аграгарадкоў, цэнтральныя сядзібы. Мы сочым, каб адміністрацыйныя, культавыя збудаванні, будынкі сістэмы адукацыі і аховы здароўя, якія забяспечваюць абслугоўванне насельніцтва, утрымліваліся ў ідэальным стане. За апошнія гады ва ўсіх сацыяльных установах адбыўся капітальны або бягучы рамонт, і я ўпэўнены, што скардзіцца іх наведвальнікам зараз няма на што. Праўда, невялікія работы засталіся яшчэ, напрыклад, у дзіцячым садку ў Жухавічах. Больш грунтоўныя пытанні, якія патрабуюць увагі, тычацца сёння дамоў культуры ў аграгарадках.

Але ж культура ў больш шырокім сэнсе слова — гэта яшчэ і культура гаспадарання, і стан аб'ектаў вытворчасці. 79% выручкі раёна фарміруецца на прадпрыемствах аграпрамысловага комплексу. Таму мы стараемся, каб аб'екты вытворчай інфраструктуры — малочнатаварныя комплексы, аб'екты жывёлагадоўлі, у прыватнасці, чатыры свінакомплексы, а таксама мехдвары, якія з'яўляюцца сэрцам любога прадпрыемства, — былі аснашчаны добрым абсталяваннем і мелі належныя ўмовы для працы. Культура павінна быць ва ўсім, перш за ўсё ў душы. Калі ёсць духоўная, маральная культура і само аблічча чалавека пацвярджае гэты факт, то ўсё будзе.

Што датычыцца нашага галоўнага аб'екта. Клопат пра замкавы комплекс не з'яўляецца сёння складанасцю для ўлад. Мірскі замак — гэта ўжо творчы і вытворчы механізм, які поруч з дзяржпадтрымкай з рэспубліканскага бюджэту каля 70% прыбытку атрымлівае ад пазабюджэтнай дзейнасці, а гэта ўласны даход. Сёлета яго наведала больш за 250 тысяч гасцей. Гэты культурны аб'ект сёння прадстаўляе пэўную вытворчасць — тут існуе ўся інфраструктура, неабходная для функцыянавання комплексу. Раённым уладам няма неабходнасці нагадваць яго супрацоўнікам пра падтрыманне парадку...



***— Выраб сувенірнай прадукцыі і ўтрыманне аграсядзіб — добрая вытворчая база й для фарміравання мясцовага бюджэту. Ці падтрымліваецца нейкім чынам гэтая дзейнасць уладамі?***

— Адна з галоўных задач, якую ставіць перад уладамі на месцах кіраўнік нашай дзяржавы, — ствараць працоўныя месцы, каб чалавек меў дастойны заробак. У нашым раёне адзін з самых нізкіх паказчыкаў беспрацоўя. І для мяне асабіста самае галоўнае, каб людзі, што б яны ні працавалі, своечасова атрымлівалі зарплату.

Важна таксама, каб чалавек займаўся справай з цікавасцю. Аднак калі аграсядзібы пераўтвараюцца толькі ў месцы для правядзення вяселляў і іншых забаўляльных мерапрыемстваў і не адпавядаюць сваёй першаснай задачы — быць турыстычнымі аб'ектамі, гэта не спрые ні напаўненню бюджэту, ні развіццю краю. Гаспадары такіх сядзіб, атрымаўшы льготныя крэдыты, пабудаваўшыся, працуюць у выніку толькі на сябе. Так не павінна быць. У аграсядзібе павінны пастаянна быць наведвальнікі, якім не толькі будзе дзе адпачыць, але і што паглядзець. У нас ёсць цудоўны прыклад такой аграсядзібы — Белыя Лугі, дзе можна ўбачыць аўтэнтычную беларускую вёску 20—30-х гадоў мінулага стагоддзя. Гаспадары скупілі апошнія хаты, што засталіся ў вёсцы Ціневічы, дзе заснавана сядзіба, і аднавілі іншыя дамы на іх былых месцах. Такім чынам яны падтрымалі, што гатовыя працаваць і для сябе, і для людзей.

***— Сярэдняя зарплата работнікаў раёна вагаецца ў межах 500-510 рублёў у месяц. Гэта вельмі неблагі паказчык. А як у цэлым характарызуецца эканамічнае становішча на Карэліччыне?***

— Эканамічная сітуацыя ў раёне не горшая, і нам няма за што перажываць. За дзевяць месяцаў бягучага года тэмп росту выручкі ад рэалізацыі прадукцыі і паслуг склаў 113% у параўнанні з папярэднім годам. У галіне сельскай гаспадаркі атрымана 115,7% выручкі, у прамысловасці — 117,9%. Пры гэтым атрымана 9,1 млн рублёў (лічбы пасля дэнамінацыі), што склала 141,6% да ўзроўню 2015-га. 7,2 млн рублёў з гэтай сумы атрымана за кошт сельскай гаспадаркі. Усе сельгасарганізацыі маюць прыбытак ад рэалізацыі, няма ніводнага стратнага прадпрыемства. 7,6 млн рублёў (148,6% да ўзроўню мінулага года) — гэта чысты прыбытак па раёне. Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі — 10,4%, а рэнтабельнасць продажу ў сельскай гаспадарцы — 10,8%.

Іншая справа, што растуць цэны на энерганосьбіты, запасныя часткі і бялкова-вітамінную сыравіну, а цана на сельскагаспадарчую прадукцыю застаецца практычна на тым жа ўзроўні, што і паўтара года таму. Гэта негатыўна ўплывае на эканоміку прадпрыемстваў. На жаль, рост заробку не апераджае рост вытворчасці. Аднак калі аб'ёмы вытворчасці павялічваюцца, мы адразу маем магчымасць павысіць зарплату і робім гэта. У нас няма ў раёне скарочаных або няпоўных працоўных дзён ні на адным прадпрыемстве.

Адзінае, што мяне хвалюе, — гэта праблема далейшага развіцця будаўнічага комплексу. Я лічу, што ў рэгіёнах трэба мяняць сістэму вызначэння падрадчыка на будаўніча-мантажныя работы і адыходзіць ад сістэмы тэндэраў. Праз дэмпінг тых, які ствараюць кампаніі, каб выйграць права на работы, пакутуе якасць. Мы хочам, каб на нашых аб'ектах працавалі нашы праверэныя людзі. Няхай гэта будзе, можа, крыху і даражэй, але мы вернем гэтыя сродкі назад у бюджэт праз падаткі. Дарэчы, у нас няма запазычанасцяў будаўнічым арганізацыям і прадпрыемствам з боку бюджэту і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў.

Для мяне няма розніцы — культурная гэта ўстанова, аб'ект жывёлагадоўлі, школа ці бальніца — усюды павінен быць гаспадар. Фінансы трэба перш за ўсё зарабіць, каб пасля правільна і аб'ектыўна размеркаваць іх па ўсіх сферах.

**Ірына СІДАРОК.** *sidarok@zviazda.by*

# КАМАНДЗІРОЎКА НА АРБІТУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Сваёй работай, у якой аб'яднаў адразу трох касманаўтаў, я хачу сказаць, што ў космасе ўсе роўныя, незалежна ад полу і нацыянальнасці, — перакананы Іван Якімавіч.

Скульптар добра ведае, што колькасць рэчаў, якія касманаўты могуць узяць з сабой на арбіту, строга абмежавана. Таму майстру асабліва грэе душу думка аб тым, што для яго работы месца знайшлося. Цяпер Іван Міско азадачаны тым, з якога матэрыялу зрабіць ліцэй, каб плакетка важыла як мага менш, — у космасе ж кожны грам на ўліку!

**«Многія думаюць, што космас — гэта рамантыка. У пэўным сэнсе так. Але ў большасці сваёй гэта цяжкі, халодны, няўтульны свет».**

— У мяне быў выпадак, калі мой медаль, прысвечаны Юрыю Гагарыну, павінен быў ляцець у космас, — успамінае народны мастак. — Прывёз яго ў Зорны гарадок, тады начальнікам Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў быў Георгій Берагавой. Першае, што яны зрабілі, адразу паклалі медаль на вагі — заважыў больш як 400 грамаў. Гэта было шмат. І Берагавой пытае: «Дык што будзем дасылаць: медаль або паліва?» Канешне, адправілі паліва.

Работа Івана Міско знаходзілася ў грузавым адсеку карабля і тады, калі Алег Навіцкі ляцеў у космас упершыню. Гэта быў медаль з партрэтам касманаўта. Але карабель з грузам да месца прызначэння не дайшоў — адбылася аварыя.

## Сустрэчы сяброў

Будучы ў Мінску, Алег Навіцкі ніколі не абмінае майстэрню Івана Міско. І не толькі, каб чарговы раз папазіраваць для скульптара. Яны любяць проста пагутарыць за кубачкам гарбаты. Апошні раз, праўда, бачыліся не ў майстэрні. У пачатку чэрвеня Алег Навіцкі разам з першымі беларускімі касманаўтамі Пятром Клімуком і Уладзімірам Кавалёнкам удзельнічаў у адкрыцці павільёна «Космас» у Баравой.

— Ці хваляваўся Алег Навіцкі перад другой камандзіроўкай на арбіту? — пытаюся ў сябра касманаўта.

— Вядома ж, гэта хвалююча, бо непрадказальна, — гаворыць Іван Якімавіч. — Многія думаюць, што космас — гэта рамантыка. У пэўным сэнсе так. Але ў большасці сваёй гэта цяжкі, халодны, няўтульны свет. Вельмі складана ў космасе псіхалагічна. Можна казаць што заўгодна, а паспрабуй хоць бы тыдзень не выходзіць з дому. Як казаў мне некалі Клімук, калі ў цябе на Зямлі нервы не ў парадку, у космасе табе няма чаго рабіць.

Касманаўты будуць жыць на станцыі 164 дні і вернуцца на Зямлю толькі ў красавіку. За гэты час яны павінны правесці больш чым 50 навуковых эксперыментаў, а таксама папрацаваць з расійскімі, амерыканскімі і японскімі касмічнымі грузавымі караблямі.

## «Я вярнуся!»

Пра тое, што касманаўт Алег Навіцкі нярэдка тэлефануе Івану Міско з самай арбіты, не ведае толькі нецікаўны. «І на мабільны, і на гарадскі тэлефанаваў — цудоўная чутнасць! — успамінае народны мастак. — «Наша размова запісана на ўсёй планеце», — сказаў мне Алег, калі вярнуўся на Зямлю».

Іван Якімавіч добра памятае, калі Алег Навіцкі патэлефанаваў яму з арбіты першы раз. Не забудзе і тое, як пехта з таварышаў спытаў: «А ці ведаеш, у што табе абыдзецца аплата размовы? Маўляў, гэта ж вельмі дарагі званок!»

Сапраўды, дарагі. Але, хутчэй, у іншым сэнсе. Іван Міско быў вельмі расчулены, калі касманаўт з арбіты павіншаваў яго з днём нараджэння. Той запіс Іван Якімавіч захоўвае як самую дарагую рэліквію. Там ёсць такія словы: «Я хутка вярнуся, і зноў у тваёй майстэрні будзем піць гарбату».

— Яго ўвесь час цягне на радзіму, — прызнаецца сябра касманаўта. — Алег любіць пагутарыць з землякамі, пабыць на прыродзе, каб атрымаць асалоду ад беларускіх краявідаў.

Дарэчы, менавіта верш Якуба Коласа «Мой родны кут» Алег Навіцкі прачытае ў космасе. На вяртанні запіс будзе перададзены ў Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей песняра.

## Падарункі з космасу

Сцяжкі, значкі, пячаткі — нямала сувеніраў Алег Навіцкі прывёз з космасу Івану Міско. Майстар ніколі яго аб гэтым не прасіў: ведае, што ў касманаўта ёсць больш важныя задачы. Але гэтым разам зрабіў выключэнне. Іван Якімавіч папрасіў Алега сфатаграфаваць з космасу Беларусь. Вядома, касманаўт рабіў гэта неадназова, але ўвесь час наша краіна з-за туманаў была дрэнна бачная. Алег Навіцкі паабяцаў сваёму сябру прывезці лепшы здымак роднай Беларусі.

— Дай Бог, каб быў і трэці палёт, — кажа Іван Міско, яшчэ не дачакаўшыся касманаўта з другога. А ўсё можа быць, бо, як кажуць, тыя, хто пабываў на арбіце, у космас іх цягне ўжо як толькі вярнуліся на Зямлю.

*Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў тэлеграму лётчыку-касманаўту Расійскай Федэрацыі Алегу Навіцкаму, паведамілі ў прэсслужбе беларускага лідара.*

*Кіраўнік дзяржавы выказаў асаблівую ўдзячнасць за тое, што ў такі адказны момант, як падрыхтоўка да старту касмічнага карабля, Алег Навіцкі не забывае пра свае карані, пра Беларусь, чый сцяг адправіцца ў космас разам з ім.*

*«Дзе б Вы ні знаходзіліся, памятайце, што Радзіма ганарыцца дастойным сынам гераічнага і працавітага беларускага народа!» — гаворыцца ў тэлеграме.*

**Вераніка КАНЮТА.**
*kanyuta@zviazda.by*

■ Супраць гвалту

# Поўнае разуменне

## Пацярпелым дзецям дапамогуць у Жодзіне

**18 лістапада ў Жодзіне адкрыецца першы Дом разумення поўнага цыкла аказання дапамогі дзецям-ахвярам або сведкам гвалту. Поўны цыкл дапамогі звязвае ўсе кампаненты адзінай мадэлі абароны дзяцей, якая прапанавана і рэалізуецца Міжнародным грамадскім аб'яднаннем «Разуменне».**

Раней у краіне дзякуючы ініцыятыве грамадскага аб'яднання з'явіліся і працягваюць работу 18 пакояў апытання. Цяпер жа размова ідзе пра ажыццяўленне дружалюбнага апытання, медыцынскі/клінічны агляд і медыцынскую судовую экспертызу, а таксама аказанне комплекснай рэабілітацыйнай дапамогі непаўналетнім, якія сталі ахвярамі злачынстваў супраць палавой недатыкальнасці, іншых формаў гвалту, а таксама тым, хто стаў сведкам цяжкіх злачынстваў.

Асобны пакой апытання абсталяваны панарамнай камерай і высокаадчувальным мікрафонам: калі дзіця і псіхолаг застануцца сам-насам, іншыя спецыялісты змогуць слухаць і назіраць за пацярпелым праз экран манітора ў суседнім пакоі. Можна будзе нават задаць праз псіхолага сваё пытанне. У гэтым жа пакоі праводзіцца псіхалагічная, псіхіятрычная і комплексная экспертызы. Медыцынскі агляд, судмедэкспертыза ажыццяўляюцца ў іншым пакоі, максімальна камфортным для дзіцяці.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

■

# ЧАЛАВЕЧЫ ФАКТАР...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Чалавечы фактар па ранейшаму застаецца галоўнай прычынай гібелі людзей на прадпрыемствах. Часта службовыя асобы, якія адказваюць за ахову працы, непрафесійна выконваюць свае абавязкі. Ды і самі пацярпелыя парушаюць элементарныя правілы, пагарджаючы стаўкай да асабістай бяспекі. «Здавалася б, сёння створана ўся нарматыўная база, неабходныя ўмовы, але часам на месцах бывае ўсё па іншаму. У большасці выпадкаў людзі атрымліваюць траўмы і гінуць з-за абыякавых адносін да сябе, незахавання правіл паводзінаў на вадзе, дарогах, на рабочым месцы», — упэўнены Алег Семянчук.

Але самае крыўднае, калі ў выніку знешніх прычын мы страчваем дзяцей. З пачатку гэтага года зарэгістравана 15 фактаў гібелі юных грамадзян, у 2014 годзе іх было 25, у 2015-м — 14. У гэтых трагедыях, як правіла, вінаваты дарослыя — недагледзелі. Малыя капіруюць дарослых. Бацька перайшоў дарогу ў недазволеным месцы. «А чаму мне нельга?» — думае дзіця.

Паміж ведамствамі Міншчыны наладжаны ўлік і абмен інфармацыяй аб дзіцячым траўматызме, карпатліва аналізуецца кожны выпадак гібелі малых і падлеткаў, распрацоўваюцца канкрэтныя прафілактычныя мерапрыемствы. У 147 установах адукацыі ўстаноўлена ручная кнопка трывожнай сігналізацыі з вывадам на пульт цэнтралізаванага назірання аддзела Дэпартамента аховы Міністэрства ўнутраных спраў. У 1011 школах працуюць сістэмы відэаназірання. У 13 раёнах вобласці і горадзе Жодзіна імі ахоплены ўсе навучальныя ўстановы.

Педагогі цэнтральнага рэгіёна наведалі больш чым 60 тыс. сем'яў, пагледзелі, у якіх умовах жывуць непаўналетнія. Акрамя таго, міжведамасныя групы абследавалі жылыя памяшканні больш чым 14,4 тыс. сем'яў. У выніку выяўлена, што 2158 дзяцей знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, а 53 — маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне. Супрацоўнікі падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях таксама ўстанавілі 869 фактаў неналежнага догляду за дзецьмі. Па кожным з іх прыняты меры рэагавання, у тым ліку 115 рашэнняў аб адабранні малых з сям'і, 9 грамадзян пазбаўлены бацькоўскіх правоў.

— У Мінскай вобласці створаны банк даных дзяцей, схільных да суіцыду. Штомесяц ён актуалізуецца, — адзначыў намеснік старшыні аблвыканкама Віктар Сірэнка. — Цяпер у ім знаходзіцца 69 юных грамадзян.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

■ Сталічны час

# БЕЗ КАЛА І ДВАРА, АЛЕ З САЦЫЯЛЬНАЙ ПАДТРЫМКАЙ

## Як дапамагаюць асобам без пэўнага месца жыхарства

**Па ініцыятыве Мінгарвыканкама пры падтрымцы ГУУС і сталічных устаноў аховы здароўя ў халодную пару года традыцыйна праводзіцца акцыя «Сацыяльны патруль». Сярод асноўных задач — не толькі захаваць жыццё бяздомных, але і матываваць іх на змену ўмоў існавання. Летась у рамках акцыі было зарэгістравана больш за 1600 зваротаў па дапамогу, аднак вырвацца са звыклага асяроддзя атрымліваецца толькі ў нешматлікіх насельнікаў вуліц.**



**Дом начнога знаходжання людзей, якія «выпалі» з соцыуму.**

Як расказала **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА**, арганізаваны мабільныя рабочыя групы, якія будуць аб'язджаць вядомыя месцы масавага збору бяздомных. У выпадку неабходнасці ім будзе аказана медыцынская дапамога з магчымасцю шпіталізацыі. Жадаючыя могуць спыніцца ў Доме начнога знаходжання, аднак, каб захаваць за сабой права пражывання, неабходна выконваць строгія ўмовы. Напрыклад, ніякага алкаголю. Дарэчы, у большасці выпадкаў менавіта ён становіцца прычынай сацыяльнага падзення. Акрамя таго, прадугледжана работа з псіхолагамі, наладжванне родnative сувязяў і галоўнае — пошук працы. Зараз у Доме начнога знаходжання занята толькі 48 месцаў з 92. Большасць лічыць за лепшае атрымліваць разавую дапамогу ў выглядзе гарачай ежы і цёплага адзення і не змяняць свой лад жыцця. Так, за 9 месяцаў гэтага года ўдалося працаўладкаваць толькі 11 чалавек, 9 — былі змешчаныя ў дом-інтэрнат, 5-ці выдзеліці ўласнае жыллё, а 25-ці аднавілі дакументы, дзякуючы чаму некаторыя з іх пачалі атрымліваць пенсіі па ўзросце або інваліднасці.

У гігіенічных мэтах у Доме начнога знаходжання кожны дзень мяняюць пасцельную бялізну. Штомесячнае ўтрыманне бяздомнага, без уліку ежы, абыходзіцца ў 432 рублі.

Вялікую дапамогу аказваюць грамадскія, у прыватнасці БРСМ, і рэлігійныя арганізацыі, валанцёры. Так, летась агульнымі сіламі было сабрана 480 кілаграмаў адзення. Адзіная ўмова, каб яно было чыстае і цэлае, найбольш запатрабаваныя цёплыя курткі і паліто, абутак. Пад кіраўніцтвам Свята-Елісавецінская манастыра ў вёсцы Лысая Гара дзейнічае падворак, які выконвае функцыі сацыяльна-працоўнай рэабілітацыі. На яго тэрыторыі ёсць дрэваапрацоўчая вытворчасць, ферма і нават прытулак для бяздомных жывёл. Калі не задавальняюць іншыя варыянты, з Дома начнога знаходжання можна трапіць наўпрост сюды. Цяпер тут жыве каля 170 чалавек.

Ірына Дудка адзначыла, што часам у рабоце з гэтай катэгорыяй грамадзян даводзіцца звяртацца да нетрадыцыйных метадаў, напрыклад, сваякоў бяздомных шукаюць нават праз праграму «Чакай мяне». Так, быў выпадак, калі жанчына ў эфіры сустрэлася са сваёй сям'ёй, а праз некалькі месяцаў збянтэжаныя дзеці пачалі тэлефанаваць сацыяльным работнікам з просьбай за любыя грошы змясціць яе ў інтэрнат, бо адаптавацца да нармальнага жыцця яна ўжо была не ў стане. Дарэчы, жанчыны складаюць каля 25% ад агульнай колькасці людзей без пэўнага месца жыхарства. Сярэдні ж партрэт — гэта мужчына каля 45 гадоў, прычым у досыць вялікай колькасці з іх на самай справе ёсць дзе жыць.

Па словах **начальніка аддзела першаснай медыка-санітарнай дапамогі камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Людмілы ЛУГАВЕЦ**, для таго, каб мець магчымасць застацца ў Доме начнога знаходжання, бяздомны ў абавязковым парадку павінен прайсці медыцынскі агляд у тэрапеўта, санапрацоўку і рэнтгенафлюараграфічнае даследаванне. Сухоты — даволі распаўсюджанае захворванне ў гэтым асяроддзі. Калі яно знаходзіцца ў актыўнай стадыі, шпіталізацыя праходзіць у абавязковым парадку. Аднак сухоты — не адзіны паказчык для правядзення лячэння, гэта можа быць любое хранічнае захворванне, якіх, як правіла, у чалавека без даху над галавой нямала. У дзённы час агляд такіх пацыентаў праходзіць у 9-й гарадской паліклініцы. Людміла Лугавец падкрэсліла, што для ўрача ўсе пацыенты роўныя, таму ніякага падзелу па сацыяльным статусе ў дачыненні да іх няма.

**Намеснік начальніка ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі ГУУС Мінгарвыканкама Віталь СЦЯПУРА** паведаміў, што сітуацыю з асобамі без пэўнага месца жыхарства ўдалося стабілізаваць, іх колькасць ідзе на зніжэнне. Калі ў пачатку 2000-х бяздомныя асаджалі пад'езды і гарышчы, то зараз, дзякуючы ўстаноўцы дамафоннай сістэмы і відэаназірання, грамадскі парадак у дамах не парушаецца. Толькі кожны 10-ы ад агульнага ліку знаходзіцца ў вышуку за правапарушэнні або па зваротах сваякоў. У мінулым сезоне падчас патрулявання была аказана дапамога тром сотням чалавек.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■

# Мінск — у спартыўным топе

## Наша сталіца ўвайшла ў 20-ку прэстыжнага рэйтынга гарадоў свету

**Інфармацыйнае агенцтва Sportcal на саміце, прысвечаным пытанням развіцця сусветнага спорту і турызму, апублікавала рэйтынг самых спартыўных гарадоў свету. Мінск увайшоў у першую 20-ку, заняўшы там 19-е месца і прадэманстраваўшы самы хуткі рост у індэксе.**



Такое месца сталіца Беларусі займае ўпершыню, наш рэйтынг падрос адразу на 32 пазіцыі. У размеркаванні месцаў улічваліся звесткі аб 610 гарадах, якія ўжо прымалі ці яшчэ плануюць правесці буйныя спартыўныя мерапрыемствы (улічвалася падзеі за 14-гадовы перыяд з 2010 па 2023 год).

«Сваім поспехам Мінск шмат у чым абавязаны паспяховаму правядзенню 45-й Генеральнай асамблеі Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў, якая адбылася сёлета. У ёй узялі ўдзел 20 прадстаўнікоў усяго сусветнага спартыўнага руху, у тым ліку прэзідэнты АНАК, ЕАК, прадстаўнікі НАКаў, аргкамітэт Алімпійскіх і Параалімпійскіх гульняў, юнацкіх Алімпійскіх гульняў і Еўрапейскіх юнацкіх алімпійскіх фестываляў», — паведамляецца на сайце Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

Узначальвае топ-20 Лондан, які ўжо пяць гадоў знаходзіцца на першым радку. Прэтэндэнт на правядзенне Алімпійскіх гульняў — 2024 Будапешт трапіў у дзясятку, падняўшыся з 12-га месца на 7-е. Рым, які адклікаў заяўку на правядзенне Алімпіяды, наадварот, апусціўся на 42-гі радок.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## Зніжка для транзітных пасажыраў

**«Белавія» зніжае на 50 працэнтаў мінімальныя тарыфы для транзітных пасажыраў з Астаны і Алматы ў Еўропу, паведамілі ў прэс-службе авіякампаніі.**

«Белавія» прапануе выгадныя прыматарыфы для транзітных пасажыраў, якія вандруюць з Астаны і Алматы ў наступныя гарады Еўропы: Амстэрдам, Барселону, Берлін, Белград, Будапешт, Варшаву, Гановер, Жэневу, Калінінград, Лондан, Мілан, Ніцу, Прагу, Рым, Стакгольм, Тэль-Авіў, Франкфурт. Авіякампанія прапануе мінус 50 працэнтаў ад мінімальнага тарыфу па ўсіх вышэйпаказаных маршрутах на перыяд падарожжа да 31 сакавіка 2017 года, выключаючы перыяд 24 снежня — 8 студзеня. У «Белавія» ўдакладнілі, што паніжаны тарыф дзейнічае таксама для пасажыраў, якія ляцяць з вышэйпералічаных гарадоў у Астану і Алматы. Максімальны тэрмін знаходжання ў пункце прызначэння павінен складаць не больш за месяц. Набыць білеты па дадзеным тарыфе можна да 20 лістапада як на сайце «Белавія», так і ў авіякасах. Тарыф дзейнічае толькі па маршруце «туды-назад». Колькасць білетаў абмежавана.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■ Май на ўвазе!

## А вы «праверыліся»?

**У пачатку наступнага тыдня стартуе агульнарэспубліканская дэкада «Дзяржтэхагляд».**

ДАІ сумесна з прадстаўнікамі «Белтэхагляду» і Транспартнай інспекцыяй Міністэрства транспарту і камунікацый у перыяд з 21 па 30 лістапада ўзмоцніць кантроль за своечасовасцю праходжання дзяржаўнага тэхнічнага агляду. Асаблівая ўвага будзе накіравана на транспартныя сродкі, якія належаць юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, а таксама на выяўленне кіроўцаў, якія ездзяць з падробнымі адзнакамі аб праходжанні дзяржтэхагляду.

Пры эксплуатацыі транспартных сродкаў без своечасова пройдзенага тэхнічнага агляду будуць прымяняцца меры адміністрацыйнага ўздзеяння. За першае на працягу года парушэнне прадугледжаны штраф да трох базавых велічынь, за паўторнае — ад двух да пяці базавых велічынь. У дачыненні да службовых асоб юрыдычных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў за допуск да ўдзелу ў дарожным руху транспартных сродкаў, якія не прайшлі дзяржаўны тэхнічны агляд, прадугледжана адказнасць у выглядзе штрафу ад чатырох да шасці базавых велічынь.

У рамках дэкады будзе праведзена прафілактычная работа сярод кіроўцаў па абавязковым выкарыстанні зімовых шын.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*

■ Інавацыі

# Адшукаць участак у рэжыме анлайн

## Вэб-тэхналогіі дазволяць землеўпарадкавальнай службе ствараць і выкарыстоўваць адзіны банк даных зямельных рэсурсаў

**Аб гэтым карэспандэнту «Звязды» паведамілі ў прэс-службе Дзяржаўнага камітэта па маёмасці. Такім чынам, на публічнай зямельна-інфармацыйнай карце Беларусі ў хуткім часе з'явіцца інфармацыя аб свабодных зямельных участках для будаўніцтва грамадзянамі жылля, свабодных участках у садаводчых таварыствах, а таксама звесткі аб незанятых інвестыцыйных пляцоўках для будаўніцтва вытворчых і іншых аб'ектаў інвестарамі.**

Супермагчымасці інфармацыйнай карты адкрыліся дзякуючы ўкараненню новых падсістэм геапартала зямельна-інфармацыйнай сістэмы (ЗІС) Беларусі, распрацоўшчыкам якога з'яўляецца праектны інстытут «Белдзіпразем» Дзяржкаммаёмасці. Кіраўніцтва камітэта адзначае, што дакладная інфармацыя з публічнай карты будзе даступнай усім зацікаўленым асобам. Геапартал ЗІС з'яўляецца сёння геаінфармацыйнай пляцоўкай узаемадзеяння ў сферы зямельных адносін і можа служыць эфектыўным сродкам інфармацыйнага забеспячэння функцый землеўпарадкавальных службаў.



Для найбольш поўнай дэманстрацыі магчымасцяў гэтага электроннага сэрвісу, спецыялісты «Белдзіпразема» сумесна з Дзяржкаммаёмасці па абласцях праводзяць серыю тэматычных семінараў. На адным з іх былі прадэманстраваны новыя падсістэмы геапартала ЗІС. Усе яны працуюць у рэжыме рэальнага часу. Вядзенне такіх падсістэм з выкарыстаннем сучасных ЗІС і вэб-тэхналогій дасць магчымасць ствараць і выкарыстоўваць адзіны банк даных зямельных рэсурсаў землеўпарадкавальнымі службамі, прадпрыемствамі сістэмы Дзяржкаммаёмасці, іншымі зацікаўленымі арганізацыямі і ведамствамі, аўтаматызаваць рабочыя працэсы для выканання такіх функцый на геапартале ЗІС.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# З шырокай каляі — на еўрапейскую

**У Брэсце прайшлі дэманстрацыйныя выпрабаванні пераходу з шырокай каляі на еўрапейскую і назад хуткага цягніка Масква-Берлін Swift.**

Як ужо паведамлялася, з 17 снежня з Масквы ў Берлін пачнуцца рэгулярныя рэйсы хуткага цягніка. Ён будзе курсіраваць два разы на тыдзень. І перастаноўка колаў з каляі на каляю кожны раз будзе праводзіцца ў Брэсце. Цяпер гэты працэс займае прыкладна дзве гадзіны, а для новага цягніка прадугледжаны час на перастаноўку — 30 хвілін. Ужо змантаравана абсталяванне, якое дасць магчымасць максімальна аўтаматызаваць названы працэс.

**Галоўны інжынер Брэсцкага аддзялення Беларускай чыгункі Сяргей КАЦУБА** паведаміў, што праект ажыццёўлены беларускай і расійскай чыгункамі. Створана новая інфраструктура, кантактная сетка для цягнікоў, падведзены чыгуначныя пуці і змантавана абсталяванне, работу якога і прадэманстравалі журналістам. Састаў праехаў па ўстаноўцы, яго вагоны прыпадняліся, а спецыялісты тут жа падаганялі памер колаў пад патрэбны стандарт.

У гэтыя дні новы цягнік праходзіць заключную абкатку па чыгунках Расіі, Беларусі, Польшчы, Германіі. Прадстаўнікі Расійскай чыгункі, якія прысутнічалі пры дэманстрацыйных выпрабаваннях, адзначылі, што ў Брэсце ўсё гатова для праходжання Swift.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Вернісаж

# УНІВЕРСАЛЬНАЯ МОВА СКУЛЬПТУРЫ

## У Мінску адкрылася першая румынска-беларуская выстава

**Знакаміты румынскі скульптар XX стагоддзя Канстанцін Брынкуш пэўную частку свайго жыцця правёў у Парыжы. Ён жыў на вуліцы Манмартр акурат у той жа час, што і вядомы беларускі мастак Марк Шагал. Цалкам верагодна, што творцы сустракаліся там і былі асабіста знаёмыя. Быццам працягваючы тое магчымае сяброўства гэтымі днямі ў Мінску адкрылася першая румынска-беларуская выстава, якая называецца «Амаж Брынкушу».**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Экспазіцыя, што прадстаўлена ў галерэі Міхаіла Савіцкага, прысвечана 140-годдзю з дня нараджэння Канстанціна Брынкуша. У свеце ён вядомы як заснавальнік абстрактнай скульптуры. Яго творчасць моцна паўплывала на многія пакаленні румынскіх скульптараў — і іх працы таксама можна ўбачыць у Мінску. Гэта Улад Чабану, Валер Няг, Іаан Поп-Вярэта, Максім Думітраш, Дарые Дуп, Іаан Грэку і іншыя. Адметна, што экспазіцыя дапоўнена таксама работамі беларускіх майстроў — Міхася Баразны, Уладзіміра Зінкевіча, Юрыя Якавенкі, Сяргея Ашуха, Фёдара Шурмялёва, Яўгена Іванова. Творы двух народаў, з аднаго боку адрозныя, захоўваюць свой нацыянальны каларыт. Але з іншага боку, яны ствараюць цікавы сінтэз нетрывіяльнага абстрактнага мастацтва.

— Мы прысутнічаем на мерапрыемстве, вельмі адметным па змесце і па прадстаўленых на ім работах, — адзначыў на ўрачыстым адкрыцці выставы **міністр культуры Беларусі Барыс СВЯТЛОЎ**. — Я назіраў таксама за музычнымі праектамі, якія былі рэалізаваныя на працягу апошняга часу. Сапраўдным выбухам, у добрым сэнсе гэтага слова, было адкрыццё румынскага кінематографа, прадстаўленага ў нас на кінафестывалі «Лістапад», які толькі нядаўна завяршыўся. І яшчэ адзін яскравы бок гэтай культуры — выстава, на адкрыцці якой мы прысутнічаем. Дзякуй вялікі румынскаму пасольству і ўсім арганізатарам.



Варта адзначыць, што адна з самых вядомых работ Канстанціна Брынкуша (у французскай транскрыпцыі яго прозвішча гучыць як Бранкузі) — гэта «Бясконцая калона». У творы майстар увасобіў вядомы матыў румынскага фальклору — «нябесную калону». У народнай творчасці румынаў яна з'явілася элементам архаічнага веравання. Скульптар стварыў цэлую серыю такіх калон — з дрэва, гіпсу, сталі. Але самая вядомая, з бронзы, — размешчана ў румынскім горадзе Тыргу-Жыў. Гэта месца лічыцца горадам вядомага скульптара. Дэлегацыя мэрыі Тыргу-Жыў спецыяльна завітала на адкрыццё выставы ў Мінск.

Пра важнасць сумеснага творчага праекта гаварыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Румыніі ў Беларусі Віярэл МАШАНУ**:

— Арганізуючы гэту выставу, мы хацелі не толькі надаць новы імпульс развіццю культурных стасункаў паміж Румыніяй і Беларуссю, але і садзейнічаць двухбаковаму супрацоўніцтву паміж нашымі краінамі, а ў больш шырокім плане, паміж ЕС і Беларуссю. Канстанцін Брынкуш — гранд абстракцыянізму, які пакінуў вялікі след у творчасці румынскіх скульптараў розных пакаленняў, якія цяпер прадстаўлены ў Мінску. Яны дапамагаюць падкрэсліць універсальнасць ідэй Брынкуша і пашырыць магчымасць для дыялогу і ўзаемаўзбагачэння культур нашых народаў.

З адметнай румынска-беларускай выставай можна азнаёміцца ў галерэі Міхаіла Савіцкага да канца гэтага тыдня.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.** *nina@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
17 ЛІСТАПАДА 2016 г.
ЧАЦВЕР
№ 21 (15805)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

# Гурт DRWIWY: «Нам не патрэбны высокі п'едэстал»


Арцём Вілейта.

**Яркі, гучны, з элементамі фры-фолку, электронікі і ўласцівай гэтаму гурту змрочнасцю ды меланхалічнасцю. Так коратка можна апісаць «Цырк беззаганны», новы альбом мінска-гомельскага праекта Drwiwy. Падаецца, што пасля досыць працяглага маўчання Арцём ВІЛЕЙТА і Сяргей ЦУРАНКОЎ рады размаўляць са слухачамі на поўны голас і чакаюць сустрэч з новай публікай. Пра рэчаіснасць і мроі, гумар і сур'ёзнасць у музыцы, а таксама важнасць заўсёды заставацца сабой — наша гутарка з Арцёмам і Сяргеем.**

***— Чаму так доўга працавалі над гэтым дыскам?***

**Сяргей:** — Нараджэнне і станаўленне «Цырка» стала для нас стамляючым мерапрыемствам, на гэта ўплывалі розныя фактары, знешнія і ўнутраныя: адлегласць, быт, расслабленасць, асяроддзе... У той жа час хаос унутры і вакол нас знайшоў сваё месца ў песнях. Паступова фарміраваўся касцяк асноўных «нумароў», але яны збольшага ўяўлялі сабою накіды, заставалася шмат працы як па аранжыроўках, так і па запісе. Некаторыя ідэі прыводзілі ў тупік, даводзілася вяртацца і пераасэнсоўваць матэрыял. Drwiwy не адносіцца да тых гуртоў, што ствараюць свае песні на рэпетыцыях, а потым ідуць у студыю і запісваюць іх. Для нас працэс напісання кампазіцыі і стварэння запісу непадзельныя. Мы хапаемся за ідэю і фарміруем з яе ўсё, што нам захочацца.

**Арцём:** — Калі шчыра, першыя песні да гэтага альбома былі напісаныя яшчэ ў 2009 годзе... Потым была інструментальная кампазіцыя «Цырк беззаганны», якая не трапіла ў фінальную версію дыска. Ёсць багата нерэалізаванага матэрыялу, што рыхтаваўся да гэтага дыска, але многае было адкладзена або да лепшых часоў, або ўвогуле адхілена. Альбом пісаўся доўга яшчэ і па тэхнічных прычынах, а таксама з-за спроб працаваць з іншымі музыкамі, што насамрэч складана для нас, бо мы даволі закрыты гурт. У нас ёсць свой свет і атмасфера, якія пачынаюць знікаць, калі нехта далучаецца. Некаторыя з музыкаў моцна падвялі падчас запісу сваёй безадказнасцю, але, можа, гэта і лепш, бо прыйшло разуменне, куды рухацца далей. Складана захаваць гурт, калі ён трымаецца толькі на атмасферы і ідэі, а не на выступленнях ці нейкай камерцыйнай зацікаўленасці.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

Не трапіць у «сеткі»

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ ФАСТ-ФУД

## Як зрабіць «прышчэпку» ад шкоднага ўздзеяння медыя?

**Днямі Facebook памылкова паведаміў пра смерць некалькіх сотняў сваіх карыстальнікаў, апублікаваўшы ў іх акаўнтах адпаведныя банеры. Такое пасланне з'явілася і на старонцы заснавальніка сацыяльнай сеткі Марка Цукерберга. Дзясяткі людзей падзяліліся скрыншотамі сваіх «увекавечаных» старонак. А супрацоўнікі Facebook прынеслі прабачэнні «ахвярам» тэхнічнай памылкі...**



Ёран Андэрсан: «59 працэнтаў усіх артыкулаў, якія распаўсюджваюцца ў сацыяльных медыя, не чытаюцца да канца...»

### Бацькоў у сябры не дабаўляем?

Каб зразумець, які ўплыў на карыстальнікаў інтэрнэта маюць Facebook і іншыя сацыяльныя сеткі, дастаткова прывесці некалькі фактаў. Менш чым за год Facebook прыцягнуў больш як 200 мільёнаў карыстальнікаў, у той час як тэлебачанню, каб сабраць вакол сябе 60 мільёнаў чалавек, спатрэбілася 13 гадоў. Сёння Facebook — трэцяя «краіна» ў свеце пасля Кітая і Індыі з колькасцю «насельніцтва» 600 мільёнаў чалавек. Кожныя 20 хвілін у Facebook распаўсюджваецца адзін мільён спасылак. Кожную гадзіну 4,5 мільёна чалавек атрымліваюць у сетцы запрашэнне на якое-небудзь мерапрыемства. Палова ўсіх карыстальнікаў праводзіць за стасункамі ў сацыяльнай сетцы ад адной да пяці гадзін у тыдзень. Штохвілінна 100 тысяч чалавек становяцца ў Facebook сябрамі. У кожнага карыстальніка ў сябрах у сацыяльных сетках — у сярэднім 195 чалавек. А колькасць «фалавераў» у Эштана Катчара і Брытні Спірс параўнальная з насельніцтвам Ірландыі і Нарвегіі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

За кулісамі прафесіі

# ЖЫЦЦЁ — ЯК ПА СЦЭНАРЫІ,

## А ЁН МОЖА БЫЦЬ САМЫМ НЕВЕРАГОДНЫМ

**Які з беларускіх тэатраў, што дзейнічаюць дагэтуль, найстарэйшы? Адказ, здаецца, відавочны — «Купалаўскі», які вядзе адлік сваёй гісторыі з 1920 года. Хаця... Ёсць у нашай краіне непрафесійны тэатр, што пачаў сваю работу ажно ў 1918-м. Знаходзіцца ён у невялікім райцэнтры — Краснаполлі. Заснавальнікамі трупы былі браты Васіль і Андрэй Шашалевічы (апошні больш вядомы пад псеўданімам Мрый) і скульптар Аляксандр Грубэ. У 1962 годзе ўстанова атрымала званне народнай. Тэатр і дагэтуль робіць стаўку на моладзь: у 2010-м на пасаду рэжысёра быў запрошаны 18-гадовы студэнт універсітэта культуры Павел Шэўлякоў, а сёлета яго замяніў Аляксандр Кузняцоў, які нядаўна адзначыў 30-годдзе.**


Аляксандр Кузняцоў знайшоў сябе за тэатральнай маскай.

— На самай справе, я ніколі нават думкі не дапускаў, што звяжу сваё жыццё з тэатрам, — распавядае Аляксандр. — Нарадзіўся і вучыўся тут, у Краснаполлі, цікавіўся ігрой на гітары і брэйк-дансам. Пачаў думаць пра паступленне толькі ў старшых класах і вельмі доўга не мог вызначыцца. Спачатку схіляўся да прафесіі педагога, потым доктара, пасля думаў пра музыку... Але ў выніку выбраў Магілёўскае дзяржаўнае вучылішча культуры імя Н.К. Крупскай (цяпер гэта Магілёўскі дзяржаўны каледж мастацтваў): паступіў на спецыяльнасць «Рэжысёр народных свят і абрадаў».

І толькі там Аляксандр зацікавіўся тэатрам. Па словах хлопца, на гэта паўплывала вялікая колькасць творчых дысцыплін, а таксама тое, што ўсе будучыя рэжысёры мелі права на бясплатнае наведванне спектакляў у Магілёўскім драматычным тэатры. Дарэчы, хлопец упершыню ўбачыў пастаноўку на вялікай сцэне толькі на першым курсе.

— Нас вялі тады на спектакль ледзь не сілком, — смяецца рэжысёр. — Я супраціўляўся: маўляў, ну які тэатр? Як цяпер памятаю, гэта быў «Трамвай «Жаданне». Тая пастаноўка цалкам перавярнула мой унутраны свет. А цікаўнасць да народных абрадаў, наадварот, знікла. Я ўжо тады зразумеў, што хачу звязаць жыццё з тэатрам.

Акрамя ведаў па будучай прафесіі, вучылішча падарыла Аляксандру і сямейнае шчасце — яго будучая жонка вучылася там жа, толькі на акцёрскім аддзяленні. Маладыя людзі разам наведвалі тэатральныя пастаноўкі — сапраўдная студэнцкая рамантыка. Калі надышоў час размеркавання, закаханых адправілі ў адзін рэгіён: Аляксандра — у клуб вёскі Сідараўка, што на Краснапольшчыне, мастацкім кіраўніком, а яго выбранніцу — у суседнія Касцюковічы выкладаць тэатральнае майстэрства ў дзіцячай школе мастацтваў. Цяпер Аляксандр — шматдзетны бацька, у яго падрастаюць трое дзяцей.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ ФАСТ-ФУД

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

Больш як 90 працэнтаў з тых, хто нарадзіўся ў XXI стагоддзі, маюць акаўнты ў розных сацыяльных медыя. Між іншым, старэйшаму пакаленню ёсць над чым задумацца: 80 працэнтаў «жыхароў» сацсетак давяраюць меркаванню сваіх анлайн-сяброў больш, чым сябрам у рэальным жыцці. Статыстыка таксама сведчыць, што дзякуючы сацыяльным сеткам у 26 разоў вырасла колькасць сексуальных злачынстваў супраць непаўналетніх. 10 гадоў — сярэдні ўзрост, з якога пачынаецца самастойнае карыстанне сацыяльнымі сеткамі. Толькі 32 працэнты дзяцей пагаджаюцца дабавіць у сябры сваіх бацькоў. Пры гэтым 80 працэнтаў дарослых лічаць, што яны ведаюць, чым займаюцца іх дзеці ў інтэрнэце, а 31 працэнт дзяцей упэўненыя ў адваротным.

## Не распаўсюджваем, а чытаем да канца!

— Дарослыя, якія думаюць, што з дапамогай устаноўленых на камп'ютары фільтраў яны могуць абараніць дзяцей ад непажаданай інфармацыі, моцна памыляюцца. Падлеткі прызнаюцца, што паролі яны ўзломваюць ужо на другі дзень, — канстатуе **навуковы супрацоўнік Інстытута інфармацыйных тэхналогій і сродкаў навучання Нацыянальнай акадэміі педагагічных навук Украіны, медыятрэнер Ніна ДЗЕМЕНЦІЕЎСКАЯ.** — Таму галоўным унутраным фільтрам і асновай медыяінфармацыйнай граматнасці павінна стаць развіццё ў падрастаючага пакалення крытычнага мыслення плюс веданне стратэгій і інструментаў для выкрыцця махлярства ў інтэрнэце.

Адзін з аўтараў тэхналогіі крытычнага мыслення **Чарльз Тэмпл назваў інтэрнэт «сярэднявечным кірмашом неадфільтраваных спасылак».** І ён меў рацыю.

— Пэўны час таму з'явілася новае паняцце — «вірус аглядальніка», — расказвае **шведскі медыяпедагог, стваральнік сайта mediekompass.se Ёран АНДЭРСАН.** — Што гэта такое? У Швецыі 71 працэнт маладых людзей ва ўзросце ад 15 да 22 гадоў штодзень глядзяць YouTube. Мая стужка ў сацыяльных медыя таксама пастаянна папаўняецца ролікамі з гэтага відэахостынгу, таму што сябры пастаянна яго праглядаюць і дзеляцца самымі, на іх погляд, цікавымі сюжэтамі.

Адна з самых папулярных тэм у Швецыі, безумоўна, Нобелеўская прэмія. Гэта падзея прымушае кожны год людзей з усяго свету звярнуць увагу на нашу краіну. І калі летась усе апладзіравалі нобелеўскай лаўрэатцы па літаратуры Святлане Алексіевіч, то ў гэтым годзе пасля абвяшчэння імя новага лаўрэата меркаванні ў грамадстве падзяліліся. Адзін з сатырычных сайтаў размясціў паведамленне пра тое, што Боб Дзілан адмаўляецца ад Нобелеўскай прэміі. Гэтым артыкулам карыстальнікі падзяліліся аж 27 тысяч разоў. Ён аказаўся на другім месцы па колькасці перапошчаных у сетках за тыдзень. У маёй стужцы на Facebook таксама секунда за секундай з'яўлялася гэтае паведамленне, якім дзяліліся сябры. І я таксама паверыў у навіну: падумаў, што Бобу Дзілану ўсё можна... Але гэта аказаўся жарт. Атрымліваецца, што інтэрнэт-карыстальнікі сляпа вераць усяму, што пішуць у сецівe, ці ў нас проста не хапае часу, каб прачытаць паведамленне да канца?

Некалькі тыдняў таму адзін са шведскіх журналістаў напісаў у буйной газеце цудоўны артыкул з наступным анонсам: «Навукоўцы сцвярджаюць, што людзі, якія не чытаюць кніг, разумнейшыя за тых, хто іх чытае». Далей паведамлялася, што ў даследаваннях узялі ўдзел 10 тысяч чалавек. Навукоўцы змаглі дакументальна пацвердзіць той факт, што людзі, якія чытаюць кнігі, маюць горшую здольнасць аналізаваць: паколькі яны чытаюць гатовыя тэксты , у іх быццам бы пагаршаецца здольнасць успрымаць рэчаіснасць. Таму зараз ва ўсіх школах рэкамендуюць выкінуць усе кнігі. У артыкуле быў загаловак, затым пяць сказаў пра высновы даследчыкаў, і толькі ў шостым было напісана: «Не, я проста жартую. Такога ідыёцкага даследавання не праводзілася. Аднак вынікі іншага даследавання сцвярджаюць, што 59 працэнтаў усіх артыкулаў, якія распаўсюджваюцца ў сацыяльных медыя, не чытаюцца да канца. А мы проста атрымліваем задавальненне ад таго, што выставілі ў сваёй стужцы артыкул з цікавым загалоўкам і анонсам. Такім чынам, 6 з 10 чалавек, якія падзеляцца гэтым артыкулам, не дачытаюць яго да канца і будуць лічыць, што калі ты не прачытаў ніводнай кніжкі, то разумнейшы за іншых. Варта задумацца... Адказнасць ляжыць на нас. Гэта мы з вамі ствараем трафік пэўным артыкулам...»




## Як нас «прадаюць» у інтэрнэце?

**Клас ВІКЛУНД, журналіст, медыяпедагог, выкладчык Вышэйшай музычнай школы ў Стакгольме** падкрэслівае, што ў Швецыі дзяцей вучаць медыяграматнасці не для таго, каб яны потым працавалі ў медыясферы, а для таго, каб крытычна ставіліся да медыя:

— Усе СМІ працуюць на камерцыйнай арэне. Прычым часцей за ўсё працуюць яны як крывое люстэрка. Адны падзеі ў свеце атрымліваюць вельмі шмат увагі, іншыя — наадварот, вельмі мала. Але задача медыяадукацыі — не выпраўленне карцінкі, а разуменне таго, як працуе крывое люстэрка, — тлумачыць Клас Віклунд. — Вельмі важна, каб чалавек мог распазнаць камерцыйныя пасылы, якія яму пастаянна навязваюцца. Вучні павінны ведаць, што сацыяльныя сеткі поўняцца дэзынфармацыяй, прапануюць нам тэсты, віктарыны, каб даведацца пра нас больш. Мы часта думаем, што выкарыстоўваем інтэрнэт, каб адукавацца і атрымаць карысную інфармацыю, а на самай справе нас там разглядаюць і аналізуюць тыя, хто хоча прадаваць рэкламу. Мы — прадукт, які сацыяльныя сеткі прапануюць сваім рэкламадаўцам.

## «Магія» сетак...

— Сёння інтэрнэт стаў другой рэчаіснасцю. Гэта месца для стасункаў, абмену інфармацыяй, яе пошуку, задавальнення сваіх унутрыасабовых патрэб, маркетынгу, адукацыі і г.д. Усе мы імкнёмся да ўвагі, хочам быць паспяховымі, выдаткоўваючы на гэта як мага менш асабістых рэсурсаў, — дзеліцца сваім бачаннем сітуацыі **педагог-псіхолаг лідскай сярэдняй школы № 11 Артур АДАМОВІЧ.** — І сацыяльныя сеткі цудоўна спраўляюцца з гэтай задачай. Бо ўсяго толькі патрабуецца запампаваць асабістае фота і дадаць да яго тэкставую інфармацыю (часцей за ўсё, выдуманую) або зрабіць «рэпост» нейкага тэксту з суполкі — і мы атрымліваем вялікую колькасць «лайкаў» і каментарыяў. Гэта якраз і ёсць тая самая ўвага, прызнанне... Да таго ж ёсць магчымасць прызнанне «рэгуляваць»: дастаткова проста выдаліць непажаданы каментар ці адправіць у чорны спіс няўручнага сябра... Часта такія паводзіны прыводзяць да інфантылізму, кліпавага мыслення і залежнасці. Жаданне вылучыцца, быць не як усе, кампенсаваць тое, чаго на самай справе няма ў чалавека, дэманстрацыя і perабольшанне сваіх якасцяў... Вось чаму сацыяльныя сеткі гэтак прыцягваюць дзяцей і падлеткаў.

Новае пакаленне, якое літаральнае жыве ў сецівe, перастае сумнявацца ў тым, што праўда, а што мана, перастае быць крытычным да сябе і свету, маладыя людзі проста знаходзяцца ў лавіне інфармацыі і «спажываюць» у першую чаргу тую, якая з'яўляецца найбольш камфортнай для засваення, — так бы мовіць, «лёгкакаларыйную».

**«Мы — прадукт, які сацыяльныя сеткі прапануюць сваім рэкламадаўцам».**

Інфармацыйны фаст-фуд прыводзіць да стомленасці мозгу, які «аб'ядаецца» інфармацыяй. Вядомы пісьменнік Джэк Траўт параўнаў мозг чалавека з губкай, перапоўненай вадой. У такой сітуацыі, каб палегчыць сваю долю, ён пачынае браць толькі самае лёгкае і яркае, а ўсё, што патрабуе разважанняў, ігнаруе. З экранаў мы атрымліваем толькі мноства слабазвязаных паміж сабой фактаў. Адсутнічае логіка, губляецца прычынна-следчая сувязь... Псіхолагі лічаць, што чалавек экраннага мыслення больш павярхоўна ўспрымае інфармацыю. Не ўнікаючы ў яе змест, ён з гатоўнасцю дае ёй ацэнку: прычым хутка і катэгарычна. А самае галоўнае — жывыя чалавечыя стасункі (тварам да твару) — робіцца сучаснаму чалавеку проста ў цяжар. Тымі, хто праводзіць асноўную частку жыцця ў віртуальнай прасторы, значна лягчэй маніпуляваць...

Роўна тры гады таму беларускія педагогі распачалі праграму ўкаранення медыяадукацыі ў школьнае выкладанне. Стварылі дыстанцыйны курс падтрыкі настаўнікаў. Напісалі дапаможнікі па медыяадукацыі. Сёння некалькі дзясяткаў школ маюць інавацыйныя пляцоўкі па фарміраванні медыяграматнасці і медыякультуры, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі. Аднак усе ўпэўненыя, што асноўная праца па фарміраванні ў вучняў крытычнага мыслення яшчэ наперадзе. Каб выйграць бітву з інфармацыйнай прасторай, намаганняў толькі энтузіястаў будзе недастаткова...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

● ТЫМ ЧАСАМ

## «Групы смерці» абясшкоджаны

**Адміністратар так званай «групы смерці» ў сацыяльных сетках, дзе падлеткаў схілялі да суіцыдаў, затрыманы ў Падмаскоўі.**

Па версіі следства, са снежня 2013-га па май 2016 года зламыснік з памочнікамі стварыў восем віртуальных груп «ВКонтакте» для прапаганды суіцыду сярод дзяцей. Доступ да груп адкрываўся па дазволе адміністратара. Далей трэба было прайсці розныя тэсты і заданні, набраць рэйтынг і атрымаць доступ да тэматычкі смерці і суіцыду. Смерць прапагандавалася як адзіны спосаб выхаду са складаных жыццёвых абставін. Некаторыя заданні павінны былі выконвацца ноччу, а недасыпанне, як вядома, зніжае валявыя і аналітычныя здольнасці. Падлеткі перасталі адэкватна ўспрымаць сітуацыю.

Ад дзеянняў затрыманага, па даных следства, пацярпелі каля 20 падлеткаў. 15 з іх учынілі самагубства ў розных рэгіёнах Расіі, суіцыды астатніх пяці не адбыліся.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

---

Складанасці выбару

# СТУДЭНЦТВА... «НА ПРОБУ»

## ЯГО АДЧУЛІ НА САБЕ ШКОЛЬНІКІ

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце правялі незвычайны эксперымент — трое абітурыентаў часова сталі студэнтамі: наведвалі лекцыі і практычныя заняткі, харчаваліся ў сталовай і ўвогуле вялі студэнцкі лад жыцця. «Палігонам» для праекта «Студэнт на тыдзень» стаў Інстытут журналістыкі БДУ. Пасля яго завяршэння ўдзельнікі падзяліліся ўражаннямі.**



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Медыятэка — выдатнае месца, каб спалучыць прыемнае з карысным.**

У склад шчаслівай «тройкі» трапілі два адзінаццацікласнікі — Уладзіслаў КАРАЛЁЎ са сталічнай гімназіі №2, Ганна КРУК з Сёмкаўскай сярэдняй школы, што пад Мінскам, а таксама выпускніца 148-й школы расійскага Краснаярска Лілія МЯШАЛКІНА (сям'я дзяўчыны сёлета пераехала ў Беларусь). Усе яны наведваюць падрыхтоўчыя курсы.

Для іх склалі асобны расклад, у якім былі профільныя дысцыпліны ўсіх спецыяльнасцей. Таму фактычна кожную пару яны знаёміліся з новай групай. Вядома, не абышлося і без агульнаадукацыйных прадметаў: мовы, гісторыі і іншых.

— Мне больш за ўсё запомнілася пара па камп'ютарнай вёрстцы, — узгадвае Ганна. — Хоць студэнты казалі, што дысцыпліна не самая захапляльная, мне на ёй было цікавей за ўсё. Менавіта тады я змагла зразумець, як дзясяткі асобных тэкстаў і фотаздымкаў пераўтвараюцца ў газету. Яшчэ спадабалася «Кіраванне кар'ерай» — дысцыпліна, якая ёсць на спецыяльнасці «Менеджмент СМІ». На занятках мы інсцэніравалі перамовы з работадаўцам, выбудоўвалі тактыку правільных паводзін у такіх умовах і іншае.

— А мяне зачапіла «Тэхніка тэле- і радыёвяшчання», якую выкладаюць студэнтам «Аўдыёвізуальных СМІ», — прызнаецца Лілія. — Мы паспрабавалі сябе ў ролі радыёвядучых, запісвалі інтэрв'ю (мне было вельмі цікава задаваць пытанні!), толькі што скорагаворкі не чыталі. Студэнты нам расказалі пра адно практыкаванне для правільнага вымаўлення: трэба чытаць тэкст з заціснутым у зубах алоўкам.

Дзяўчаты сцвярджаюць, што трапляць кожную пару ў новы калектыў ім было няцяжка — «аднакурснікі» ставіліся да навічкоў вельмі прыхільна.

— Больш за тое, мы былі "мясцовымі" славутасцямі, — смяецца Лілія. — Да нас усе самі падыходзілі знаёміцца, таму напрыканцы тыдня мы ведалі вельмі многіх. Давалі інтэрв'ю факультэцкім СМІ, наогул кажучы, мы — «зоркі».

Вядома, студэнт жыве не аднымі заняткамі. Адно з месцаў «паломніцтва» і абавязкова візіту «студэнтаў на тыдзень» — сталовая. Дзяўчаты прызнаюцца, што пакаштавалі амаль усё меню — вынікамі задаволены. Адпачываць на «фортках» хадзілі ў факультэцкую медыятэку — разглядалі ўпрыгожаныя малюнкамі сцены, гулялі ў шашкі і, вядома, чыталі кнігі...

— Універсітэт моцна адрозніваецца ад школы, — кажа Лілія. — Калі ад настаўніка інфармацыя ідзе ў адным кірунку, то на парах мы пераважна вядзём дыялог, абмяркоўваем розныя тэмы, самі робім высновы. Гэта, безумоўна, цікавей. Тыдзень мне аднaзначна дапамог — я ўпэўнілася ў сваім выбары будучай прафесіі, пабачыла навучальны працэс знутры і вызначылася са спецыяльнасцю, якая мне найбольш даспадобы — хачу працаваць на радыё.

— Мне тут таксама падабаецца больш, чым у школе, — дадае Ганна. — Я здзівілася тым, што мне па душы, на кожнай пары было нешта цікавае. Ды і сама прафесія журналіста вельмі захапляе. Я зразумела, што праца на тэлебачанні ці радыё не для мяне, пакуль вагаюся паміж менеджментам і вэб-журналістыкай. А яшчэ мы атрымалі магчымасць напісаць па публікацыі ва ўласныя партфоліа, якія патрабуюць пры паступленні, — увесь тыдзень вялі асабістыя дзённікі, куды запісвалі свае ўражанні. Пазней іх апублікуюць на факультэцкім сайце.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

*Новыя гарызонты*

# «100 ІДЭЙ ДЛЯ БЕЛАРУСІ»: ПЕРАЗАГРУЗКА,

## ці Ад конкурсу да маштабнага форуму навукі і інавацый

**Грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» дало старт рэгіянальным адборачным турам рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Ужо прайшло больш як 130 такіх выстаў. Нядаўна ў Барысаве адбылася Мінская абласная выстава-прэзентацыя лепшых новых маладзёжных ідэй. На працягу лістапада-снежня аналагічныя адборачныя туры конкурсу будуць праведзены ва ўсіх абласцях і ў Мінску.**

Арганізатары падвядуць вынікі і вызначаць пераможцаў маладзёжнага праекта ў студзені-лютым 2017 года. Адзін з праектаў фіналу атрымае грашовы грант у памеры 5 тысяч долараў ад кампаніі «Кока-Кола». Усяго ў рэспубліканскай выставе-прэзентацыі плануецца прадставіць каля 120 праектаў. Упершыню ў склад рэспубліканскага экспертнага Савета акрамя прадстаўнікоў навукі, бізнесу, адукацыі, маладых і паспяховых прадпрымальнікаў, міжнародных экспертаў увойдуць пераможцы конкурсу «100 ідэй для Беларусі» мінулых гадоў.

Дарэчы, да гранд-фіналу будзе выдадзены своеасаблівы каталог з «гісторыямі поспеху» маладых распрацоўшчыкаў, чые ідэі і праекты па выніках удзелу ў конкурсе «100 ідэй для Беларусі» ўжо рэалізаваныя.

Вынікам правядзення конкурсу на працягу пяці гадоў з'яўляецца не толькі рэалізацыя праектаў, але і стварэнне ўдзельнікамі суб'ектаў гаспадарання. Напрыклад, пераможца конкурсу ў 2013 годзе Павел Бацылеў і фіналіст конкурсу 2012 года Вадзім Васкевіч заснавалі IT-кампанію па стварэнні і прасоўванні сайтаў, якая сёння паспяхова развіваецца і рэалізуе IT-праекты.

— У мэтах далейшага развіцця конкурсу мы плануем выбудаваць сістэму грантаў і падтрымкі аўтараў праектаў як фінансава, так і інфармацыйна, — сказала **каардынатар праекта Алеся ВІННІК.** — Прапрацоўваецца пытанне дзеяння своеасаблівых «пластыкавых карт» для інтэлектуальнай моладзі — пераможцаў рэспубліканскага маладзёжнага конкурсу «100 ідэй для Беларусі». Хацелася б, каб ён у далейшым трансфармаваўся ў маштабны форум навукі і інавацый.

Дарэчы, з верасня 2011 года ў адрас арганізатараў конкурсу паступіла больш за 9 тысяч заявак. Толькі за мінулы год атрымана 2,5 тысячы новых прапаноў ад моладзі. Да канца гэтага года па ўсёй краіне плануецца адзначыць укаранёныя інавацыйныя распрацоўкі спецыяльнымі таблічкамі з лагатыпам конкурсу «Рэалізавана ў рамках «100 ідэй для Беларусі».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

*Першая спроба*

# ПРАЦАЎЛАДКАВАЦЦА ДА ВЫПУСКУ,

## або Бонус для амбіцыйных

**Для часткі выпускнікоў ВНУ першае працоўнае месца часам бывае не такім ужо і першым. Некаторыя студэнты навучыліся ўпісваць у свой распарадак дня работу і паспяваюць вучыцца на дзённым аддзяленні.**

Знайсці работу **Ганне АРУЦІНЯН** дапамог выпадак. Дзяўчына атрымлівае адукацыю ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па спецыяльнасці «музыказнаўства», цяпер яна на чацвёртым курсе.

— У канцы лета я спрабавала ўладкавацца настаўнікам музыкі. Звярталася ў музычныя школы, а ў выніку працу мне прапанавала навучальная ўстанова, куды я яшчэ не паспела патэлефанаваць. Гэта было так нечакана і прыемна. Работа, па-першае, дае мне практычны досвед, я вучуся займацца з дзецьмі і шукаць з імі агульную мову. Падругое, мне падабаецца займацца чымсьці яшчэ, акрамя вучобы. Па-трэцяе, гэта дадатковы заробак, які ніколі не будзе лішнім, бо хочацца мець свае сродкі для жыцця і тым самым не трывожыць бацькоў. Наогул, я тэмпераментны чалавек, таму не стамляюся ад актыўнага рытму жыцця, а, наадварот, натхняюся і атрымліваю станоўчую энергію. Праца дазваляе мне адчуваць сябе самастойнай і дарослай. Сярод маіх аднакурснікаў таксама ёсць шмат тых, хто аднačасова і працуе, і атрымлівае адукацыю.


У Дзмітрыя Вайцяхоўскага трайная нагрузка.

Пяцікурснік **Дзмітрый ВАЙЦЯХОЎСКІ** вучыцца на факультэце камп'ютарных сістэм і сетак у БДУІР. Гэтым летам хлопец не змог атрымаць пакой у інтэрнаце, што прымусіла яго шукаць кватэру і, адпаведна, сродкі на пражыццё. Вакансіі студэнт праглядаў на сайтах. Схадзіў на некалькі субяседаванняў, у выніку ўладкаваўся ў фірму, якая займаецца распрацоўкай сайтаў. Нагрузка ў Дзімы, бадай, не двайная, а трайная, бо, акрамя працы і вучобы, малады чалавек здымае і манціруе відэаролікі для маладзёжнага тэлебачання БДУІР MOL.TV.

— Ад работы атрымліваю тое, што хацеў, і нават больш. Напачатку мэтай быў заробак, хоць былі ваганні паміж уласнай працай і дапамогай бацьку, які займаецца бізнесам дома, у Лідзе. Аднак потым заехалася большай самастойнасці, бо прыехаць, дапамагчы я магу і так, — расказвае Дзіма. — Заняткі на факультэце пачынаюцца ў другой палове дня, так што праца не перашкаджае вучобе. Да таго ж, кіраўнік кампаніі сітуацыю разумее, можа прабачыць, калі сыдзеш раней ці спознішся «па абставінах». Высыпаюся, канешне, па рэштказым прынцыпе, але ноччу мне лепей працуецца. Выхадныя праводжу з сябрамі альбо ў Мінску, альбо ў Лідзе, так што з мінусаў падпрацоўкі магу назваць толькі тое, што вымушаны доўга сядзець за камп'ютарам, а гэта шкодна для вачэй.

Мінчанін **Арцём ЖЫЗНЕЎСКІ** вучыцца ў БДУІР на трэцім курсе на факультэце камп'ютарнага праектавання, але першы працоўны вопыт атрымлівае не па спецыяльнасці. Хлопец разам з сябрам уладкаваўся падсобным рабочым на будоўлю.

— Нас там вялікая кампанія студэнтаў. На трэцім курсе пачалася другая змена, дзень «разбіты» і планаваць нешта на яго першую палову не атрымліваецца. Працуем па выхадных, дадатковая нагрузка дае нядрэнны дадатковы заробак, бо пражыць на студэнцкую стыпендыю праблематычна. Вольнага часу паменела, але на стасункі з сябрамі, асабістае жыццё і заняткі спортам стараюся не забывацца.


Ганна Аруцінян падпрацоўвае па спецыяльнасці.

Вучыцца ў сталіцу студэнт трэцяга курса факультэта камп'ютарных сістэм і сетак БДУІР **Дзяніс ЛЕАНЕНКА** прыехаў з Віцебска. Упершыню сур'ёзна падумаў пра ўладкаванне на працу некалькі месяцаў назад, таму калі вырашыў, што яму не хапае вузкаспецыяльных ведаў.

— Акадэмічныя дысцыпліны, пашыраны кругагляд — гэта добра, але патрэбен яшчэ спецыфічны досвед, за які табе будзе плаціць грошы наймальнік, — перакананы хлопец. — Лічу, што ўніверсітэт дае падмурак, дзякуючы якому будзеш працаваць у далейшым. А вось падпрацоўкі, практыка, курсы — гэта ўжо рэальнае прымяненне ведаў.

Падпрацоўку Дзяніс шукаў па спецыяльнасці. Наймальнікі не патрабавалі вопыту, іх цікавіла ўменне прапаноўваць ідэі, рашаць лагічныя задачы. На другі тыдзень субяседаванняў хлопцу патэлефанавалі з IT-кампаніі і паведамілі, што згодныя ўзяць яго на працу.

— Работа — гэта вялікі бонус. Карысны, калі ты здольны сумяшчаць яе з асноўным заняткам. Часам на выхадных арганізоўваю «вучэбны марафон» — выконваю заданні на тыдзень наперад. Трэба быць гатовым, што знікне паўнавартасны сон, бывае, адпачываеш тры гадзіны ў суткі.

Адной з галоўных прычын, што падштурхнула да падпрацовак, Дзяніс называе свой характар. Хлопец лічыць сябе амбіцыйным чалавекам, якому куды горш сядзець на адным месцы і не мець магчымасці рэалізавацца, чым недасыпаць.

— З плюсоў — практычны вопыт, матэрыяльная забяспечанасць, новае кола знаёмстваў, задавальненне амбіцый, упэўненасць у працаўладкаванні па любімым і знаёмым кірунку. З мінусаў — адказнасць: ты павінен адмовіцца ад часткі забаў, каб выканаць работу, і фізічны стрэс, — падводзіць вынік студэнт. — Відавочна, што ўладкаванне на працу прынесла значна больш карысці. Хоць лічу, што кожны перад тым, як шукаць работу, павінен вызначыцца, наколькі яму гэта патрэбна, і параўнаць шкоду і карысць ад падвойнай нагрузкі па ўласных крытэрыях.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*




# ДА РЭЧАІСНАСЦІ ПРАЗ ГУЛЬНЮ

**Стаўленне да камп'ютарных гульняў у большасці людзей пераважна скептычнае. Маўляў, дзіцячая забава гэтыя вашы стралялкі-бегалкі, сур'ёзнаму чалавеку такое нецікава. Некаторыя шчыра ўпэўнены ў шкодзе падобнага хобі. Нярэдка кажуць і пра сувязь камп'ютарных забаў з рознымі інцыдэнтамі і нават трагедыямі. Плюсоў жа ў геймерства быццам бы і няма. Але гэта толькі на першы погляд. Прывяду некалькі прыкладаў з уласнага жыцця.**

Тыповае восеньскае надвор'е на выхад з дому не натхняла, таму вырашыў «расчахліць» гульнявую кансоль і пагуляць у «Ведзьмака» — адну з самых папулярных у свеце камп'ютарных гульняў у жанры RPG, распрацаваную паводле раманаў Анджэя Сапкоўскага. У выніку поўнасцю «выпаў» з жыцця на некалькі дзён. І справа не столькі ў самім гульнявым працэсе (хоць, безумоўна, вандраваць па выдуманым маляўнічым свеце і змагацца з монстрамі і антаганістамі цікава), колькі ў кантэксце.

**Добрая камп'ютарная гульня — сапраўдны пазнавальны «кактэйль», які можа аб'ядноўваць самыя розныя сферы: ад гісторыі фальклору да мастацтва і навукі.**

Па сюжэце галоўнага героя, ведзьмака Геральта заносіць на Скелігэ — архіпелаг, у многім спісаны з рэальнай Скандынавіі. Падчас гульні на гэтай лакацыі гучыць вельмі прыгожая музыка. Адна мелодыя захапіла мяне настолькі, што я вырашыў пашукаць пра яе больш падрабязную інфармацыю. Аказалася, што кампазіцыя, якая так мне спадабалася, не проста прыдумка распрацоўшчыкаў, а перапрацоўка песня на мове шатландскіх гэлаў канца XVIII стагоддзя. У тэксце апісваецца гісторыя маладой дзяўчыны, каханы якой адправіўся ў плаванне і не вяртаецца. Яна стаіць на самым высокім пагорку на востраве, углядаецца ў далячынь і спявае сваю песню.

Аказалася, што практычна ўся гульня, нягледзячы на сваю «фэнтэзійнасць», амаль цалкам пабудавана на рэальным фальклоры народаў Усходняй і Паўночнай Еўропы. Мяне зацікавіла, а ці ёсць у ёй нешта беларускае? Пачаў прыслухоўвацца да адной з мелодый і пачуў родную мову, няхай і з заўважным акцэнтам! Адзін з самых вядомых саўндтрэкаў гульні, які гучыць падчас боек, — беларуская народная песня «Бегла старожа» (яе некалі выконваў Леанід Барткевіч).

Гэта я ўсё да чаго вяду? Добрая камп'ютарная гульня — сапраўдны пазнавальны «кактэйль», які можа аб'ядноўваць самыя розныя сферы: ад гісторыі фальклору да мастацтва і навукі. Выкарыстоўваць гульні для навучання — адзін з найлепшых спосабаў прывабіць увагу хоць дашкольніка, хоць дарослага чалавека.

Не верыце? Пэўны час я захапляўся гульнямі серыі Silent Hunter — сімулятарам падводных лодак часоў Другой сусветнай вайны. Акрамя непасрэднага вывучэння тагачаснай тэхнікі, праходжанне сюжэта дало адказ на пытанне: чаму фашысцкая Германія прайграла так званую «Бітву за Атлантыку». Ды і ўвогуле пазнаёміла з гісторыяй развіцця навукі і тэхналогій у ваенны час. А, напрыклад, у шведскай стратэгіі Hearts of Iron можна ўзначаліць любую еўрапейскую дзяржаву напярэдадні вайны і змяніць ход гісторыі, кіруючы яе эканомікай, унутранай і знешняй палітыкай. Гульня максімальна дакладна (галоўнае, відовішчна) паказвае ўмовы, у якіх знаходзіліся краіны-ўдзельніцы канфлікту, дэманструе рэальнае ўзбраенне і абапіраецца на ключавыя гістарычныя падзеі — ніводны падручнік не захапляе так моцна.

Маладыя навукоўцы і даследчыкі з усяго свету, якія «выраслі на камп'ютарах», змяняюць свет — пры дапамозе краўдфандынгавых платформ, накшталт Kickstarter, з'явіліся дзясяткі прарыўных распрацовак. Таму не трэба скардзіцца на гульні — разумны чалавек возьме з іх толькі лепшае. Нездарма некалькі гадоў таму ў адной са школ Стакгольма ўвялі заняткі па... гульні ў Minecraft.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
17 11 2016 г.

*На сваім месцы*

# НЕ «ПЛЫЦЬ» ПА ЦЯЧЭННІ

## Малады трэнер не дазваляе расслабляцца сабе і не раіць іншым

**Выхаванцам дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы №2 у Пружанах пашанцавала. Там працуе 24-гадовы Юрый ЛІПІЧ. Энергічны, прыгожы і зусім не падобны на тыповага «фізрука» з анекдотаў.**

— Трэнер па плаванні — гучыць нядрэнна. Дзяўчатам падабаецца! — усміхаецца Юра. — Стаў я ім выпадкова. Канешне, з дзяцінства любіў спорт, ці, больш правільна, фізічную культуру. Пасля школы без ваганняў і роздуму паступіў у БДУФК на трэнера па валейболе. Ніколькі аб сваім выбары не шкадую і ганаруся тым, што маю дыплом універсітэта фізкультуры.

**«Нават не спрабую стварыць вобраз «грознага дзядзькі», якога ўсе баяцца і слухаюць. Яны павінны бачыць ўва мне звычайнага чалавека, які ведае крыху больш за іх».**

Пасля выпуску хлопец ведаў, што хутка яго забяруць у армію, таму шукаў часовую работу. У дзіцяча-юнацкай спартыўнай школе №2 Пружан якраз было вакантнае месца, хоць яно і не зусім адпавядала спецыяльнасці, якую меў Юра. «На сумоўі ў мяне запыталі, ці змагу я навучыць плаваць дзяцей? «Змагу!» З гэтага ўсё і пачалося», — успамінае малады трэнер. Праўда, напрыканцы навучальнага года (заставалася літаральна некалькі тыдняў да канікул) прыйшла павестка з ваенкамата.

— У арміі была магчымасць паглядзець на сваё жыццё збоку. Сябры, якія не служылі, часта пытаюцца, ці не шкадую я, што страціў цэлы год? Наадварот, здабыў! Напрыклад, армія змяніла маё стаўленне да часу. Я навучыўся больш умела распараджацца ім: за дзень мог зрабіць столькі, колькі дома рабіў бы тры дні. Табе даюць загад, ты яго выконваеш і не шукаеш для гэтага ніякай матывацыі. Зараз мне гэта часта дапамагае. Бяру і раблю без лішніх слоў!

У маі Юра вярнуўся з арміі, і яго адразу ж запрасілі зноў працаваць у школе. Бацькі некаторых выхаванцаў цікавіліся, ці можна будзе аддаць сваіх дзяцей у групу да маладога спецыяліста. Для яго гэта азначала адно — справу ён сваю выконваў добра, за год пра яе не забыліся, таму трэба працягваць далей.

— Я працую ў спартыўнай школе, а не ў забаўляльным цэнтры. Мы рыхтуем спартсменаў, калі пашанцуе, то, можа, нават будучых алімпійскіх чэмпіёнаў. Таму патрабаванні да дзяцей, што ў нас займаюцца, крыху завышаныя. Калі коратка казаць пра мае абавязкі, то я вучу дзяцей плаваць і дапамагаю ім удасканальваць іх уменні. Вядома, працэс навучання працякае неадрыўна ад выхавання. Жартую, цікаўлюся іх жыццём па-за спартыўнай школай. Яны бачаць, што мне не ўсё роўна, таму амаль заўсёды ідуць на кантакт. Толькі потым тлумачу дзецям, што хачу ад іх. Нават не спрабую стварыць вобраз «грознага дзядзькі», якога ўсе баяцца і слухаюць. Яны павінны бачыць ўва мне звычайнага чалавека, які ведае крыху больш за іх.

Выхаванцам Юры ад 6 да 9 гадоў. Да арміі ў яго была група пяцігадовых дзяцей. Ён успамінае, што тады прыходзілася нялёгка. Сёлета дырэктар вырашыў павысіць узрост плыўцоў. На думку трэнера, нядрэнны вопыт ён набыў, пакуль працаваў у дзіцячых летніках і падчас студэнцкай практыкі ў школе.

Складанасць Юравай працы ў тым, што ён не толькі вучыць плаваць, але і сочыць за бяспекай дзяцей. На першых занятках перад тым, як запусціць выхаванцаў у басейн, доўга інструктуе іх аб правілах паводзін. А пасля яшчэ дзясятак разоў нагадвае: не сваволіць, не пырскацца, не тапіць адно аднаго і яшчэ шмат іншых «не». У групе чатырнаццаць чалавек, таму нельга ні на секунду адвярнуцца ад басейна.

— На мой погляд, кожны трэнер павінен знаходзіцца ў добрай фізічнай форме. Паколькі ён на ўласным прыкладзе стварае пэўную матывацыю ў дзяцей да заняткаў. У выхаванцаў не з'явіцца даверу да цябе і тваёй працы, калі ты дрэнна выглядаеш. Таму я і сам актыўна займаюся ў вольны час — плаваю, бегаю, хаджу ў трэнажорную залу.

Працоўны дзень трэнера пачынаецца ў 17 гадзін, калі ўсе іншыя людзі ўжо вяртаюцца з работы. А заканчваецца праз тры гадзіны. «Гэта не можа не радаваць! — кажа Юра. — Але асноўная прычына, па якой я тут працую, — мне вельмі падабаецца вучыць дзяцей. Я ўпэўнены, што ў гэтым маё прызванне. Многія з маіх аднакурснікаў працуюць не па спецыяльнасці. Робяць тое, за што плацяць грошай больш, а я так не хачу. Адзінае, аб чым шкадую, што блізкія сябры засталіся ў сталіцы і бачыцца ён з імі рэдка.



**«Кожны трэнер павінен знаходзіцца ў добрай фізічнай форме. Таму я і сам актыўна займаюся ў вольны час — плаваю, бегаю, хаджу ў трэнажорную залу».**

Хлопец не планаваў пасля выпуску з універсітэта вяртацца дадому, але сёння нават рады, што ўсё склалася менавіта так. Адзінае, аб чым шкадуе, што блізкія сябры засталіся ў сталіцы і бачыцца ён з імі рэдка.

Каб не сумаваць і не марнаваць вольны час, якога пры такім працоўным графіку хапае, Юрый уладкаваўся яшчэ і мастацкім кіраўніком на палову стаўкі ў сельскі Дом культуры.

— Ведаю, што пра «фізрукоў» існуе шмат стэрэатыпаў, многія з якіх часта апраўдваюць сябе. Што да мяне, то я іх разбураю. Можна шмат увагі надаваць фізічнай культуры, але пры гэтым быць творчай асобай. Я, напрыклад, пішу песні і спяваю іх пад гітару. У арміі нават быў удзельнікам гурта «Бясконцасць». А цяпер, каб далей развіваць свае музыкальныя і артыстычныя здольнасці, працую ў ДК. Асноўная задача — вучыць дзяцей танцаваць (так-так, зноў праца з падрастаючым пакаленнем). Пры гэтым ёсць магчымасць арганізоўваць канцэрты і выступаць самому. Карацей, рабіць нешта для душы, але пры гэтым яшчэ і якія-ніякія грошы атрымоўваць, — разважае Юра. — Вось такія бываюць «фізрукі»!

**Ганна КУРАК,**
**студэнтка V курса Інстытута журналістыкі БДУ.**

# ЖЫЦЦЁ — ЯК ПА СЦЭНАРЫІ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

У 2009 годзе ён вярнуўся ў Краснаполле. Спецыялісту прапанавалі пасаду метадыста ў мясцовым Цэнтры культуры. Але, акрамя вялікага аб'ёму «папяровай» працы, хлопец займаўся і творчасцю: выконваў ролі ў тэатры, займаўся арганізацыяй масавых свят і іншых мерапрыемстваў. Тады ж паспрабаваў паступіць на тэатральную рэжысуру ў БДУКМ — не прайшоў па балах. У 2012 годзе калегі ўгаварылі хлопца зрабіць яшчэ адну спробу, апошнюю. На гэты раз усё ўдалося.

**У сярэднім двойчы на год у рэпертуары з'яўляюцца новыя спектаклі — нядрэнны паказчык нават для прафесійнага тэатра. А колькасць паказаў назваць нават пералічыць цяжка.**

— Рыхтаваўся па кірунку «народная рэжысура», бо гэта тое, у чым я добра разбіраюся, — тлумачыць хлопец. — Мне, дарэчы, у апошні момант прапаноўвалі «перакінуць» дакументы якраз на тэатральную рэжысуру, але я адмовіўся. Часта кажуць, што завочная адукацыя — гэта фармальнасць, асабліва па творчых спецыяльнасцях, але ў нас усё зусім не так. У першую чаргу, дзякуючы выдатным выкладчыкам, якія літаральна жывуць сваёй справай, умеюць захапіць студэнта прадметам. У якасці прыкладу можна назваць Рыгора Іванавіча Баравіка, Ганну Мікалаеўну Сулімa — яны за кароткі тэрмін далі нам больш, чым любы падручнік, на іх парах мы сядзелі да позняга вечара.

— Галоўная асаблівасць Краснапольскага тэатра заключаецца ў тым, што іграюць у ім пераважна непрафесіяналы, — распавядае Аляксандр. — Таму ёсць свае асаблівасці. Напрыклад, мы імкнёмся выбіраць пастаноўкі з невялікай колькасцю герояў, бо пастаянная трупы ў нас няма.



Фестываль «Тэатральныя вечарыны» — значная падзея для Краснаполля.

У рэпертуары тэатра — самыя розныя творы. Вельмі шмат беларускай класікі: «Паўлінка» Купалы, «Суд» Галубка... Не забываюцца і на сучасных аўтараў. Папярэднік Аляксандра, рэжысёр Павел Шэўлякоў ставіў «Не пакідай мяне» Аляксея Дударава. Ён жа выкарыстаў фрагменты з «Чарнобыльскай малітвы» Святланы Алексіевіч у сваёй аўтарскай пастаноўцы «Хроніка кінутай зямлі» — з ёй трупа ў красавіку ездзіла на канферэнцыю да 30-годдзя катастрофы на ЧАЭС у нямецкі Гамбург. Ставяць і п'есы расійскіх аўтараў, напрыклад, Вольгі Сцяпновай. Ёсць і дзіцячыя пастаноўкі.

У сярэднім двойчы на год у рэпертуары з'яўляюцца новыя спектаклі — нядрэнны паказчык нават для прафесійнага тэатра. А колькасць паказаў цяжка нават пералічыць. Трупа ўвесь час у раз'ездах: як па рэгіёне (выступаюць у клубах аграгарадкоў Краснапольшчыны і суседніх раёнаў), так і па краіне, і нават за яе межамі.

— Мне падабаецца, што ў нас шмат моладзі, таму ў тэатры і Цэнтры культуры ўвесь час вельмі сяброўская атмасфера, — кажа Аляксандр, разглядаючы стэнд са здымкамі акцёраў. — Усе — людзі розных прафесій, але разам нам цікава. Вось, напрыклад, Віктар Лазовік — навуковы супрацоўнік мясцовага музея. Юрый Мотрычаў заняты ў сферы дрэваапрацоўкі. Ёсць настаўнікі, урачы, пенсіянеры. А вось Наталля — наш мастак-пастаноўшчык, яна можа зрабіць абсалютна любыя дэкарацыі з падручных сродкаў. У адным з дзіцячых спектакляў я выконваю ролю грыба, і яна зрабіла мне капялюшык са... звычайнага парасона.

На базе Цэнтра культуры раз на два гады праводзяць міжрэгіянальны фестываль-свята аматарскіх тэатраў «Тэатральныя вечарыны». Нядаўна адбыўся чарговы з іх. Арганізацыяй займаўся Аляксандр. Наведвальнікаў было вельмі многа, бо для Краснаполля фестываль — адно са знакавых мерапрыемстваў.

— Пэўны час форум быў у заняпадзе, але з прыходам маладых супрацоўнікаў ён адрадзіўся, — распавядае хлопец. — Для нас прынцыпова захаваць фестываль, бо, калі мы не будзем падтрымліваць аматарскія тэатры, яны стануць нікому не патрэбныя.

**«Галоўная асаблівасць Краснапольскага тэатра заключаецца ў тым, што іграюць у ім пераважна непрафесіяналы. Таму ёсць свае асаблівасці. Напрыклад, мы імкнёмся выбіраць пастаноўкі з невялікай колькасцю герояў, бо пастаянная трупы ў нас няма».**

— Далёка сваю будучыню я не планую, — кажа Аляксандр. — У творчых планах — паставіць дзіцячую п'есу «Лятучы карабель». Памятаеце, быў такі мульцік? Вядома, трохі пераасэнсаваўшы сюжэт з адаптацыяй яго пад сучаснасць. Яшчэ хочацца нарэшце «замахнуцца» на сур'ёзную драму. Трэба дапісаць дыплом, каб атрымаць «вышку»... А далей — будзем глядзець. Магчыма, калі-небудзь атрымаецца паспрабаваць сябе на тэлебачанні — гэта мая мара.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*
*Мінск — Краснаполле — Мінск.*

І так бывае

# «Я ПА ЖЫЦЦІ — ЗВЫЧАЙНЫ ПАЦАН»

## Днём — трактарыст Максім, ноччу — рэпер Max1maX

**При першай сустрэчы Максім Асаёнак падаўся звычайным хлопцам. Я ўбачыла яго, калі працавала ў студатрадзе на ўборцы яблыкаў. Ён быў за рулём трактара і адказваў за дастаўку пладоў на базу. Тады я яшчэ не ведала, што 21-гадовы хлопец родам са Смалявіч не толькі з лёгкасцю спраўляецца з «жалезным канём» на рабоце, але і здольны рэчытатывам выдаваць смелыя куплеты. Цяпер у творчай скарбонцы рэпера па складзе душы і механізатара другога класа па прафесіі — больш за 40 трэкаў. У кожным з іх — глыбокі сэнс: мір ва ўсім свеце, здароўе родных і блізкіх, хуткаплынчасць часу, каханне і сяброўства, будучае...**

*«Без мітусні ідзі па жыцці, роўна ўзняўшы твар. Не думай ні пра што і ўсміхайся ўсім назло» («Таксама бывае»)*

Прачнуўшыся ў 6 гадзін раніцы, Максім выпівае кубак моцнай кавы, будзіць суседзяў па пакоі ў інтэрнаце і хутка збіраецца на работу. Ужо два гады запар а 7 гадзіне ён на трактары выязджае з тэрыторыі агракамбіната «Ждановічы» на базу. На пастаяннае месца працы хлопец трапіў не адразу...

Пасля вучобы ў Смалявіцкім дзяржаўным каледжы па спецыяльнасці «аўтаслесар, трактарыст» і паўгадавога пражывання ў бабулі Максім у пошуках вольнага хлеба выправіўся ў сталіцу, але там не склалася...

— Работа ў садзе вельмі падабаецца. Летам мы акультураем дрэвы, вясной — падкормліваем, восенню збіраем ураджай, а зімою падразаем кроны. Я працую на тэхніцы: езджу па пясок, чышчу снег, у полі ару, — расказвае малады спецыяліст.

На пытанне пра зарплату Максім адказвае, доўга не думаючы: «Усё залежыць ад сезона. Калі я працаваў летам па 12 гадзін без выхадных, то атрымаў нядрэнную суму, амаль у два разы большую за звычайную. Шчыра — заробленых грошай хапае, нават няма часу, каб іх патраціць».

Максім часам задумваецца аб змене сферы дзейнасці: «Хацеў у тэатральны падацца, аднак разумею, што прабіцца туды вельмі складана: сур'ёзная канкурэнцыя ў гэтай справе. Мне і на трактары някепска. Галоўнае, што інтэрнат далі: і да работы блізка, і Мінск пад бокам».

*«Я дакладна абяцаю сябрам і блізкім, што, пакуль я з вамі, будзе ўсё выдатна» («12 гадоў»)*

Акрамя фізічнай культуры і працоўнага навучання, наш герой аддаваў перавагу ў школе рускай мове і літаратуры. Ён ужо тады сябраваў з рыфмай: складаў уласныя вершы і запісваў іх у асобны сшытак. «Па сутнасці, я быў добрым гультаём, — робіць шчырае прызнанне Максім. — Але калі патрабавалі вывучыць якінебудзь твор на памяць, то я імкнуўся зрабіць гэта як мага больш арыгінальна. Вучыў вершы і спяваў, настаўнікі і аднакласнікі мяне падтрымлівалі».



— Рэп складаць я пачаў зусім нечакана. Гэта адбылося некалькі гадоў таму... Усё пачалося з таго, што я да 12 гадоў страціў сваіх родных па татавай лініі. Тата памёр, калі мне быў год. Матулю пазбавілі бацькоўскіх правоў, і я апынуўся ў прытулку. Калі вучыўся на другім курсе каледжа, трэніраваў пачаткоўцаў у школе брэйк-данса ў Смалявічах. Старэйшыя хлопцы ўсе самавучкі былі, трэніраваліся ў падвалах, а потым заснавалі школу. Займаўся танцамі тры з паловай гады, пакуль не атрымаў траўму рукі. Мяркую, што калі б не страціў брэйк, то не набыў бы рэп.

Падчас вучобы хлопца нечакана знайшлі сваякі — дзядзька, цётка, бабуля, а хросная маці паабяцала аформіць на Максіма апякунства. Той дзень, калі знайшлися родзічы, малады чалавек памятае як сёння: прыйшоў з заняткаў і заснуў, а потым нечакана ўскочыў і напісаў першы тэкст. «Мой першы трэк «12 гадоў» расказвае, як цяжка было ўвесь гэты час без дапамогі блізкіх, — тлумачыць Max1maX. — Але я ні аб чым не шкадую і нікога не вінавачу. Гэта, наадварот, дало мне стымул у жыцці ісці толькі наперад і цвёрда стаяць на нагах».

Радкі з трэка «Наш фрыстайл» — «Не, ну ў чым праблемы!? Дзяўчаты, вы адурэлі, пагрэбавалі і перасталі цаніць нашы задумы», — адлюстроўваюць крыху скептычнае і недаверлівае стаўленне рэп-выканаўцы да жаночага полу. «Насамрэч, пісаў я гэтыя словы па прыколу, — усміхаецца хлопец. — Проста я шмат разважаю ў апошні час пра тое, чаго дзяўчаты ад нас хочуць?! Са скуры вон лезеш, каб ім спадабацца...»

*«Музыка — гэта стан душы, факт безгранічча, пакарэння вяршынь...» («Музыка»)*

У адным з трэкаў Максіма гучыць думка: «Музыка здольная выратаваць мяне ад падзення мары». Напэўна, гэтым жыццёвым прынцыпам кіраваўся наш герой, калі пачаў мэтанакіравана дзейнічаць: пісаць новыя песні, выступаць на канцэртах, удзельнічаць у рэперскіх батлах у сталічных клубах.

Пачынаў Максім разам з мясцовым хлопцам. Той падказаў чалавека, у якога была дамашняя студыя. Запісалі сумесны трэк «Пра ўсё» і назваліся Best Rhymes. «Я Улада лічу сваім братам. Мы ніколі не мераліся, хто круцейшы: я пераўзыходзіў яго па якасці рэчытатыву, ён на «выдатна» рыфмаваў радкі. Калі былі разам, мы «валілі» нядрэнны рэп», — успамінае Макс. Потым хлопцы прыдумалі ўласныя нікнэймы. Спачатку Максім быў MC Joy, таму што «фанацеў» ад рэп-выканаўцы Джоні Боя. У дзяцінстве любіў, калі яго называлі і Максімам, і Максам. Так і нарадзіўся новы творчы псеўданім Max1maX.

— Першыя публічныя выступленні пачаліся ў Смалявічах. Мы прыходзілі ў гарадскі Дом культуры і прасіліся выступіць з некалькімі кампазіцыямі на розных гарадскіх святах. Калі крыху натрэніраваліся, вырашылі прабівацца ў сталіцу. Выступалі ў клубах на чыстым энтузіязме, гэта быў самапіяр. Першае выступленне ў сталіцы адбылося, як ні смешна, у рокербары. Тады сабралася процьма гледачоў. Калі выходзіш упершыню, пачынаеш раскальхваць залу, усе глядзяць на цябе з пытаннем: хто вы такія і навошта сюды прыйшлі? Прыемна было, калі людзі пачалі пазнаваць нас і нават падпяваць.



Для Максіма самае галоўнае ў творчасці — выпрацаваць уласны стыль. Па словах хлопца, Баста, Гуф, Oxxxymiron, Eminem валодаюць асаблівай індывідуальнай «фішкай», з іх варта браць прыклад. Сярод айчынных ён выдзяляе «Нестандартны варыянт» і «Не будзіце спячых». «Я яшчэ не вызначыўся са стылем, — гаворыць Макс. — Хтосьці спыняецца на андэграўндзе (больш спакойны рэп), іншыя на лірыцы («сюсі-мусі» пра каханне). У мяне ўсё ад настрою залежыць. Магу душэўны трэк зрабіць, часам хочацца спыніцца на жорсткім сінгле — і я буду яго пісаць да канца. Праўда, на пачатку трэка я папярэджваю: «Увага, ненарматыўная лексіка».

*«Мы робім будучыню самі сваімі рукамі» («Мы робім будучыню самі»)*

Апошні год у Максіма не хапае часу на выступленні і новыя трэкі. Цяжка ствараць, калі, акрамя цябе, у пакоі жывуць яшчэ тры хлопцы. Быў час, калі Макс хадзіў зімою адзін па вуліцы ў навушніках і з блакнотам, прыдумваў тэксты, мармытаў сабе нешта пад нос, палохаў мінакоў. Сваім прыкладам ён пацвердзіў: галоўнае, каб было жаданне, а час заўсёды можна знайсці для любімай справы.

— Я люблю творчыя эксперыменты. Хацеў бы паспрабаваць сябе ў ролі саліста якой-небудзь інструментальнай групы тыпу джаза. Нават у рэп пачаў уключаць вакальныя прыпевы, і публіка добра іх успрымае. Наогул, у жыцці для мяне галоўнае — цвёрда стаяць на нагах і мець канкрэтную мэту, каб было да чаго імкнуцца. А яшчэ ў любой сітуацыі і пры любых выпадках — заставацца чалавекам.

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.**
*veronika.ulasevich@mail.ru*

А вы ведалі?

# «Тяни-Толкай»: першы ганарар — палова курыцы,

## ці Хто з групы ў дзяцінстве марыў стаць... пажарнай машынкай

**Група «Тяни-Толкай» умее завесці любую публіку. Тым не менш яны ведаюць, што гэта такое, калі ў цябе не вераць і кажуць, што ў тваёй задумы няма будучыні. Многія здаюцца без падтрымкі, але толькі не яны. Нам удалося пагутарыць з удзельнікамі групы і даведацца, у чым жа сакрэт іх запалу.**

***— Хто аўтар вашых песень?***

**Павел КЛЫШЭЎСКІ:** — У асноўным я. Дарэчы, напачатку Заяц і Тараймовіч не хацелі браць у групу, казалі, што ў мяне няма слыху. І я за ноч падабраў на сінтэзатары некалькі вядомых песень, уключаючы бітлоўскую Yesterday. Даказаў ім адваротнае, і яны прынялі мяне.

***— Першае выступленне групы было ў суседа на вяселлі...***

**Кірыл КЛІШЭВІЧ:** — Тое выступленне запомнілі назаўсёды... Сустрэўшы маладажонаў песняй гурта Metallica і «спаліўшы» калонку, мы сумленна адпрацавалі два дні і атрымалі свой першы ганарар — 15 долараў і... палову вэнджанай курыцы.



**Павел КЛЫШЭЎСКІ:** — А мне яно чымсьці нагадвае выступленне ў Палацы Рэспублікі. Падчас яго мы вельмі хваляваліся, было шмат родных, сяброў і знаёмых у зале. Гэтыя адчуванні мне нагадалі тое самае першае выступленне... А так час, вядома, прайшоў, і з'явілася іншыя адчуванні.

***— Няўжо вы зусім перасталі хвалявацца на сцэне?***

**Андрэй ЗАЯЦ:** — Хваляванне ёсць заўсёды, але гэта ўжо не страх. Дарэчы, перад чужымі мне няхк лягчэй спяваць, чым перад блізкімі.

***— Які выпадак у жыцці падштурхнуў вас стаць артыстамі?***

**Андрэй ЗАЯЦ:** — Усё пачалося са старой гітары, якую прынеслі да нас у кампанію. Спачатку мы igралі простыя песні, не трапляючы ў ноты. Потым зразумелі, што нам падабаецца іграць і спяваць. А далей ужо нікуды не змаглі ад гэтага падзецца. Вось так звычайная старая гітара стала пачаткам нашай кар'еры.

***— Павел, вы былі вядучым у праграме «Компас». А якое месца — ваша любімае?***

**Павел КЛЫШЭЎСКІ:** — Мы вельмі часта бываем на гастролях. Цяпер ужо вельмі складана назваць горад у краіне, дзе не было б нашых сольных канцэртаў ці іншых выступленняў. Але найчасцей мы наведваем Гомель. І ўсё ж, напэўна, любімае месца — гэта дом, у якім вельмі ўтульна і заўсёды можна адпачыць. Дом — гэта тое месца, дзе заўсёды можна сабраць усіх блізкіх, заварыць гарбату і пагутарыць па душах. Эмоцыі, якія атрымліваеш у такія моманты, ні з чым не параўнаюцца.

***— Публіка ў вас была самая розная. Якія з выступленняў вам запомніліся найбольш?***

**Павел КЛЫШЭЎСКІ:** — Калі спявалі ў жаночай калоніі перад асуджанымі. Яшчэ мы выступалі на дні нараджэння аднаго чалавека, на яхце.

***— Цяпер вы вядомыя артысты. А кім хацелі стаць у дзяцінстве?***

**Павел КЛЫШЭЎСКІ:** — Як і ўсе дзеці — касманаўтамі, урачамі *(смяюцца)*. Але ёсць сярод нас адзін, хто вылучыўся ў гэтым плане. Кірыл Клішэвіч у дзяцінстве хацеў стаць пажарнай машынкай і не разумеў, чаму бацькі з гэтага смяюцца.

***— Што маглі б пажадаць маладым групам?***

**Андрэй ЗАЯЦ:** — Кідаць гэтую справу *(смяюцца)*. А калі сур'ёзна, то вялізнага цярпення. Калі мы толькі пачыналі, то ў нас ніхто не верыў. Казалі, што без сувязяў і грошай нічога не выйдзе, але ў нас усё атрымалася. Таму галоўнае ў жыцці — не здавацца!

На такой матывуючай фразе закончылася наша гутарка. У групе «Тяни-Толкай», на мой погляд, усе ўдзельнікі з выдатным пачуццём гумару. Мы спадзяёмся, што гэта не апошняя наша сустрэча, бо бачыцца з імі — адно задавальненне.

**Ангеліна НОВІКАВА,**
**вучаніца 11 класа гімназіі №1 г. Дзяржынска.**

# Извещение о проведении 28 ноября 2016 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| № | Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества | Начальная цена без НДС | Размер задатка |
| 1. | «Автозаправка с площадкой» общей площадью 5221,5 кв. м, инв. номер 630/С-67164, расположенная по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143Н (назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) с составными частями и принадлежностями | 199 000,00 бел. руб. (1 990 000 000 бел. руб. образца 2000 года) | 19 900,00 бел. руб. (199 000 000 бел. руб. образца 2000 года) |
| 2. | «Склад готовой продукции» общей площадью 807,1 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 630/С-73745, расположенный по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143/6 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 78 400,00 бел. руб. (784 000 000 бел. руб. образца 2000 года) | 7 840,00 бел. руб. (78 400 000 бел. руб. образца 2000 года) |

**Продавец имущества:** ОАО «Электромодуль», ул. Великий Гостинец, 143, 222310, г. Молодечно.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 процентов от цены продажи предметов торгов в соответствии с протоколом о результатах торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Электромодуль», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный *счет государственного предприятия «МГЦН» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся **28 ноября 2016 года в 16.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 17.11.2016 по 24.11.2016 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (0176) 74-72-04 (ОАО «Электромодуль»).**

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| **Наименование (описание) имущества и его стоимость** | **ЛОТ № 1. Изолированное помещение с инв. №200/D-115915, назначение – складское помещение, общей площадью 766,3 м кв., стоимостью 132 486 рублей 00 копеек.**<br>**ЛОТ № 2. Капитальное строение с инв. №200/С-83635, назначение – здание склада промышленных товаров, общей площадью 621,3 м кв., стоимостью 113 159 рублей 00 копеек.**<br>**ЛОТ № 3. Изолированное помещение с инв. №200/В-115916, назначение – административное помещение, общей площадью 300,0 м кв., стоимостью 138 166 рублей 00 копеек** |
| **Собственник (владелец) имущества** | ЧУТПП «Терра-Нова» (УНП 300506707) |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | Лот № 1. г. Витебск, ул. Ленинградская, 163, пом. 2<br>Лот № 2. г. Витебск, ул. Ленинградская, 163/1<br>Лот № 3. г. Витебск, ул. Ленинградская, 163, пом. 1 |
| **Наличие обременений** | Залог ОАО «Белвнешэкономбанк» |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **05.12.2016 в 11.00**<br>**г. Витебск, ул. Кирова, д. 16, каб. 11** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | Отдел принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска<br>210001, г. Витебск, ул. Кирова, д. 16.<br>Судебный исполнитель Мухина Наталья Михайловна, тел./факс (80212) 63-64-76,<br>начальник отдела Зарецкая Елена Витальевна, тел. (80212) 60-84-42 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет отдела принудительного исполнения Железнодорожного района г. Витебска р/с № 3642903000328 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801635, УНП 300002505, **не позднее 11.00 01.12.2016 г.**<br>Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота.<br>В соответствии с частью 3 статьи 486 Гражданского процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества |

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении 29 ноября 2016 г. в 10.00 повторного открытого аукциона со снижением начальной цены на 50% после предыдущих несостоявшихся торгов по продаже объектов недвижимости – зданий, сооружений, передаточных устройств и оборудования, расположенных по адресу: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74, принадлежащих Открытому акционерному обществу «Гомельхлебпром» на праве собственности**

| Лот №1 | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Наименование объекта | Адрес объекта | Краткая характеристика объекта | Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, бел.руб. (в т.ч. НДС 20%) |
| Трансформаторная подстанция, **инв. №330/С-21152** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74А | Назначение: сооружение специализированное энергетики. Одноэтажное строение, 1984 г. постройки. Общая площадь 40,7 м кв. | **876 722,4** *(Справочно: начальная цена без учета деноминации 8 767 224 000 бел. рублей)* | **8 500, 00** *(Справочно: сумма задатка без учета деноминации 85 000 000 бел. рублей)* |
| ***Земельный участок** на праве постоянного пользования площадью **0,0063 га** с кадастровым номером 323550100006000767. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь* | | | | |
| Мазутонасосная, **инв. №330/С-11451** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/2 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1984 г. постройки. Общая площадь 100,4 м кв. | | |
| Помещение для соли, **инв. №330/С-11450** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/1 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1984 г. постройки. Общая площадь 74,6 м кв. **Здание сдано в аренду сроком по 14.01.2017 г.** | | |
| Здание склада инвентаря и оборудования, **инв. №330/С-11449** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/6 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1985 г. постройки. Общая площадь 196,5 м кв. *Составные части и принадлежности: тамбур.* | | |
| Сухарный цех с пристройкой и подсобным корпусом, **инв. №330/С-11453** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74/3 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Одноэтажное строение, 1954 г. постройки. Общая площадь 925,1 м кв. *Составные части и принадлежности: тамбур, пристройка к сухарному цеху, подсобный корпус, рампа с навесом, площадка с крыльцом, крыльцо, отмостка* | | |
| Здание главного производственного корпуса, **инв. №330/С-11447** | Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Пролетарская, 74 | Назначение: здание специализированное для общественного питания. Трехэтажное строение, 1955 г. постройки. Общая площадь 2171,2 м кв. **Части здания общей площадью 328,77 сданы в аренду максимальным сроком по 12.05.2017 г.** | | |
| Сооружения | Ворота выездные, две дымовые трубы, ворота на весовую, ворота аварийного выезда, ограждение, ограждение металлическое, площадка с ограждением для песка, бетонная площадка, благоустройство территории (асфальтированное покрытие) | | | |
| Передаточные устройства | Сети канализационные, инв. № 330/С-22386; наружные сети канализационные, инв. № 330/С-22383; наружные сети водопроводные, инв. № 330/С-22384; внеплощадочные сети водопроводные, инв. № 330/С-22385; сеть наружного освещения, слаботочная электрическая сеть, низковольтная электрическая сеть | | | |
| ***Земельный участок** на праве постоянного пользования площадью **1,2982 га** с кадастровым номером 341500000006000008. На указанном земельном участке **расположено сооружение специализированное гражданской обороны с инв. № 330/-20619,** общей площадью **164,9 м кв.,** находящееся в собственности Республики Беларусь. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь* | | | | |
| Оборудование | Силос для склада БХМ – 12 единиц, котлоагрегат Е-1/9 – 3 единицы, деаэрационный бак, деаэрационная колонна, весы автоматические. Электрические щиты и приборы: трансформатор ТМ400 – 2 единицы, ячейка КСО 366 – 2 единицы, регулятор реактивной мощности, теплосчетчик | | | |
| Шаг аукциона – 5%.<br>Цель использования Объектов – за исключением производства хлебобулочных и кондитерских изделий | | | | |

Место проведения аукциона: **г. Гомель, ул. Артема, 23.** Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 28 ноября 2016 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать юридические и физические лица, а также индивидуальные предприниматели, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявляемому лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **29 ноября 2016 г**. Допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников.

Аукционные торги проводятся в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь и Положением о порядке организации и проведения аукционов, утвержденным Организатором торгов.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить Объекты по начальной цене, увеличенной на 5%.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; представитель юридического лица (резидента РБ) – паспорт (руководитель – копию документа о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; консолидированные участники дополнительно предоставляют копию договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора; представитель юридического лица (нерезидента РБ) – легализованные в установленном порядке доверенность на участие в аукционе и подписание документов (руководитель – копию документа, подтверждающего назначение на должность), копии учредительных документов и выписку из государственного (торгового) реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», г. Минск, код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе **по лоту №1** согласно извещению в газете «Звязда» от 17 ноября 2016 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшими победителем (лицом, приравненным к победителю), будет засчитан в счет окончательной стоимости объектов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю), Организатор торгов возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (лицо, приравненное к победителю) обязан:** в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона уплатить Организатору аукциона вознаграждение по результатам аукциона в размере 0,5% от окончательной цены продажи Объектов; в течение 20 календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи Объектов; в сроки согласно заключенному договору купли-продажи выплатить Продавцу стоимость Объектов, сформированную в установленном порядке. Если между Продавцом и Победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение срока, установленного для заключения договора купли-продажи Объектов, не достигнута договоренность по срокам и порядке оплаты за Объекты, такая оплата должна быть произведена в течение 60 календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

*Извещения о предыдущих несостоявшихся торгах по данному лоту были опубликованы в газете «Звязда» от 14.09.2016 г. №177, от 25.10.2016 г. № 206.*

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23.**
**☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by**
**Продавец: ОАО «Гомельхлебпром», г. Гомель, ул. Интернациональная, 8. ☎ 8 (0232) 21-50-33; 21-50-34 •**

**28 декабря 2016 г.** **№11-С/2016**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ в ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ в г. Гомеле

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер участка | Площадь, га | Наличие ограничений | Целевое назначение | Начальная стоимость, руб./коп. | Сумма задатка, руб./коп. | Затраты на подготовку документации, руб./коп. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | ул. Деповская (район жилого дома № 19а) | 340100000004001393 | 0,1313 | ограничений в использовании не имеет | для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 21 481 р. 57 коп. (214 815 728 р.) | 1 074 р. 08 коп. (10 740 786 р.) | 2 166 р. 92 коп. (21 669 200 р.) |
| 2 | в районе улиц Механическая – Бирюзовая (район индивидуальной жилой застройки «Новая жизнь») | 340100000002005823 | 0,1158 | охранные зоны электрических сетей | | 20 549 р. 44 коп. (205 494 352 р.) | 1 027 р. 47 коп. (10 274 718 р.) | 2 113 р. 74 коп. (21 137 436 р.) |
| 3 | по переулку Оранжерейному (в районе жилого дома №2) | 340100000002005851 | 0,0514 | ограничений в использовании не имеет | | 9 004 р. 58 коп. (90 045 810) | 450 р. 23 коп. (4 502 291 р.) | 2 631 р. 27 коп. (26 312 700 р.) |

1. **Организатор аукционных торгов – Коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр» (далее – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр»).**

2. Объекты выставляются на аукционные торги в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 г. № 462. Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется согласно техническим условиям, выданным эксплуатирующими и согласующими организациями на стадии производства проектно-изыскательских работ. Желающим предварительно ознакомиться с документами и характеристикой расположенных на участке инженерных коммуникаций, строений, сооружений, инженерно-технических условий необходимо обращаться в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр», расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.

3. **Аукцион состоится 28 декабря 2016 г. в 15.00 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. 115** при наличии не менее двух участников на каждый лот.

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, негосударственные юридические лица Республики Беларусь, подавшие в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка, в размере, указанном в извещении, с отметкой банка, на **р/с 3012203080014 в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, МФО 151501912. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе.** Кроме того, **НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в филиале ГОУ ОАО «Белагропромбанк» по адресу: г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 для возврата задатка за участие в аукционе** (в случае непобеды на аукционных торгах).

Необходимые докумены:

4.1. гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

4.2. представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность;

4.3. представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

4.4. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

5. **Кроме стоимости предмета аукциона и затрат на подготовку документации, победитель обязан возместить организатору аукциона затраты на подготовку и проведение аукциона.** Оплата стоимости предмета аукциона и возмещение расходов, связанных с проведением аукциона, подготовкой документации, осуществляется в установленном порядке в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Если заявление на участие в аукционе подано только одним гражданином или юридическим лицом, земельный участок предоставляется этому лицу при его согласии с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

6. Гомельским городским исполнительным комитетом в установленном законодательством порядке может быть предоставлена рассрочка внесения оплаты стоимости предмета аукциона в соответствии с решением Гомельского городского исполнительного комитета от 04.02.2009 г. № 83 «Об утверждении Инструкции о порядке предоставления рассрочки по внесению платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

7. **Заявления с приложением необходимых документов для участия в аукционе принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 17 ноября по 26 декабря 2016 г. включительно. Дни приема: понедельник, среда, пятница с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 2-й этаж, каб. 2-14.**

Заключительная регистрация зарегистрированных участников аукциона с 14.40 в день проведения аукциона по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16, каб. № 115.

Контактный телефон **41-97-86.** Информация размещена на сайте: **www.qomel.qov.by** либо **geodezcentr.by**

*Маршрутамі экстрэмалаў*

# ДАРОГА Ў «МАГАДАН»

## Яна праходзіць праз зімовыя балоты і не толькі

**У любы час года ўдзельнікі суполкі «Магадан» гатовыя сабраць рукзак і выправіцца ў дарогу. Для іх задавальненне фарсіраваць рэчку ў кастрычніку і цэлы дзень правесці па калена ў балоце. Іх радуюць горы, пакрытыя лёдам, вадзяныя парогі і лясныя гушчары. Словам, унутры кожнага з гэтых сур'ёзных людзей жыве авантурыст. Ці, можа, проста турыст?**



Студэнты Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Аляксандр Смірноў, Аляксей Глазкоў, Максім Ачарэтні, Вячаслаў Андрасюк і Сяргей Новік заўсёды любілі выбірацца разам то ў паход, то на рыбалку. Аднойчы хлопцы вырашылі з'ездзіць у Магадан. Купілі стары УАЗ, што ў народзе называюць «буханкай», і рушылі ў дарогу.

— Ад Беларусі да Магадана каля 11 тысяч кіламетраў, гэта самая аддаленая частка сушы ў Еўразіі. Было цікава дабрацца туды на машыне. Сем гадоў таму не ўсюды былі пракладзены дарогі, пабудаваны масты, а нам хацелася цяжкасцяў, — успамінае цяпер ужо кандыдат медыцынскіх навук, дырэктар па развіцці ТАА «Пракцыя» Аляксандр Смірноў. — Наш шлях праходзіў цераз горы, самыя буйныя рэкі кантыненту па маляўнічых краявідах. Мы сустракалі людзей, якія пыталіся: «А хіба да нас ёсць дарога з мацерыка?» Прыгод хапала, і мы пачалі апісваць уражанні на сайце. Той займеў папулярнасць, і калі праз 40 дзён вярнуліся ў Мінск, вырашылі, што будзем ствараць з «Магадана» падабенства турыстычнай сацыяльнай сеткі. Любы чалавек, пасля базавай праверкі паведамлення мадэратарам, можа размясціць у ёй свае статусы, фотаздымкі, справаздачы з паходаў. Спачатку да вандровак далучаліся знаёмыя, сёння ў турыстычным клубе 80—90 пастаянных удзельнікаў, і сайт у розны час мае ад 3 да 15 тысяч чытачоў.

**«Мне трапілася вялікая карычневая лужына, з яе чэрпалі кубкам ваду, кіпяцілі і пілі. Па смаку на сок агурка падобна».**

Трапіць у «Магадан» можа любы чалавек, была б толькі ахвота да прыгод і незалежнасць ад камфортных умоў. Сёння самаму сталаму вандроўніку суполкі 67 гадоў, а самыя малодшыя яшчэ не пайшлі ў школу.

Галоўнае падчас вандровак — назапасіць уражанні, але часта ўдзельнікі выконваюць і іншыя задачы. Напрыклад, ладзяць этнаграфічныя даследаванні, арганізуюць для спадарожнікаў лекцыі на самыя розныя тэмы, а бывае,ператвараюць іх у сапраўдныя тэатральныя выступленні. Паколькі суполку заснавалі людзі з медыцынскай адукацыяй, паход можа ператварыцца ў «эксперымент на сабе». Вывучаюцца магчымасці правільнага харчавання падчас падарожжаў, спосабы памяншэння пабочных уздзеянняў горнай хваробы. Удзельнікі перад вандроўкай абследуюцца ў баракамеры, параўноўваюць біяхімічныя аналізы крыві да і пасля, разлічваюць, як будзе змяняцца стан арганізма ў розных умовах. Навуковых работ па гэтых даследаваннях пакуль ніхто не напісаў, але вопыту назапашана дастаткова і ў плане найбольш прыдатнай экіпіроўкі, і кантролю за самаадчуваннем у дарозе.

Яшчэ адна асаблівасць суполкі — справаздачы пасля вандровак. Гэта нават закон сайта. Спачатку навічку даюць асвоіцца, а з трэцяй-чацвёртай вандроўкі прапануюць напісаць пра свае ўражанні. Удзельнікі з добрым стылем становяцца пастаяннымі аўтарамі. На аднастайнасць сюжэтаў у справаздачах суполка «не хварэе». Чаго, напрыклад, каштуе аповед пра паход на выжыванне, які аднойчы зладзілі ў якасці эксперыменту. З сабою аматары вандровак тады ўзялі па восем прадметаў адзення, а кіраўнік паходу дадаткова вызначыў яшчэ па дзве рэчы кожнаму ўдзельніку, напрыклад, бутэльку для вады і нож. Так, без ежы, і выправіліся ў лес на тры дні. Як аказалася, за такі тэрмін можна асвоіць рыбную лоўлю на спружынку ад запальніцы і навучыцца гатаваць карэнішчы дзядоўніку замест бульбы. Аляксандр, які быў там удзельнікам, мяркуе, што эксперымент даказаў: пры неабходнасці жыць на «падножных харчах» на прыродзе можна болей за тыдзень.

Пакуль у сваіх вандроўках «магаданаўцы» не дабраліся хіба што да Антарктыды і Паўночнага полюса. У розны час экспедыцыі выязджалі ў Індыю, Кітай, Паўднёвую і Паўночную Амерыку, Афрыку, Ісландыю, Памір, Непал, Нарвегію, Грузію. Вандруюць і па Беларусі, прычым адкрылі тут новы для нашай краіны турыстычны кірунак. Раней у суполцы ён называўся «рухам па азімуце». Кіраўнік групы выбіраў лясіста-забалочаную мясцовасць, вызначаў напрамак па компасе і рухаўся па прамой лініі, прычым няважна, што наперадзе: лес, рэчка ці наогул балота. З такіх выпрабаванняў вырас балоцінг — вандроўкі па падтопленых землях. Людзі звычайна стараюцца абыходзіць мясціны з «дрэннай рэпутацыяй», і прырода там застаецца ў некранутым стане. Акрамя таго, на балоце пастаянна адчуваецца дыскамфорт, а гэта, як кажа Аляксандр, надае падарожжу дадатковую прывабнасць:

— У Беларусі мы імкнёмся змясціць чалавека ў максімальна няўтульныя ўмовы, каб дзе-небудзь у гарах, седзячы мокрым, галодным і замёрзлым без напарніка на голым уступе, ён не дэмаралізаваўся, а спакойна сказаў сам сабе: «Ну, мы ўсё гэта праходзілі, не складаней, чым зімой на балоце пад Мінскам».

Лезці ў самую дрыгву вандроўнікам ніхто не прапануе. Маршрут балоцінга распрацоўваецца, як і любы турыстычны. «Магаданаўцы» праглядаюць карты, водгукі папярэднікаў, калі такія ёсць, старыя планы мясцовасці. Гэта дапамагае пракласці шлях побач са сцежкамі, гацямі, каб у выпадку чаго быў шанц збочыць на бяспечны ўчастак. Вышэй пояса група ў балота таксама не заходзіць. Што тычыцца рыштунку, то спрактыкаваныя ўдзельнікі раяць навічкам надзяваць лёгкі абутак, штаны або шорты, бо бессэнсоўна засцерагацца ад вады, яна ўсё роўна знойдзе шчыліну. А вось узяць запасны камплект адзення на вечар трэба абавязкова.

**Можна асвоіць рыбную лоўлю на спружынку ад запальніцы і навучыцца гатаваць карэнішчы дзядоўніку замест бульбы.**

Сам Аляксандр у такіх вандроўках удзельнічае не першы раз і лічыць, што пабачыць сапраўднае суровае балота можна толькі восенню і вясной, калі там поўна вады. Летам жа здараюцца непрадугледжаныя абставіны, напрыклад, маршрут нечакана перасыхае.

— Гады тры таму выдалася анамальна цёплае лета, а мы якраз выправіліся ў вандроўку. На месцы аказалася, што вады ў балоце амаль няма. Пакуль да вячэрняга лагера ішлі — залазілі ў любую лужыну, уцякаліся ў мох, каб пазбавіцца ад духаты. Калі дабраліся да месца стаянкі, зразумелі: там таксама ўсё перасохла. Звычайна прадукты і ваду мы стараемся браць з сабою на ўвесь тэрмін падарожжа, але тут не разлічылі. Давялося шукаць якую-небудзь вільгаць. Мне трапілася вялікая карычневая лужына, з яе чэрпалі кубкам ваду, кіпяцілі і пілі. Па смаку на сок агурка падобна. У якой іншай краіне я на такое не адважыўся б...



Наогул, падарожжы «Магадана» не прывязаныя да «турыстычных сезонаў» альбо надвор'я. Напрыклад, сёлета група з 16 чалавек выправілася на балоты на поўнач краіны ў кастрычніку. Быў у аматараў вандровак і вопыт зімовых пераходаў, праўда, не па дрыгве, а па пойме. Тады падарожнікам давялося ісці па пояс у вадзе пры нулявой тэмпературы. Зверху сыпле снег, перад табой — тонкі лёд, які трэба праломваць, каб рухацца далей, і навокал няма ні аднаго сухога кавалка зямлі да гарызонту.

— Звычайна па Беларусі мы робім «паходы выхаднога дня» — гэта ад двух да чатырох дзён, — кажа Аляксандр. — Сёлета мяркуем у канцы лістапада зладзіць масавы веласіпедны заезд у Налібоцкай пушчы з нагоды заканчэння веласезона. Яшчэ — паўдзельнічаць у традыцыйным скалалазным выездзе пад Жытомірам. У снежні магчымыя невялікія пешыя вандроўкі. Наогул, зімой катаемся на лыжах, на веласіпедах па замёрзлых рэках — атрымліваецца не горш за паездку па магістралі. У наступным годзе плануем з'ездзіць на Каўказскія горы, павучыць навічкоў альпінізму і патрэніравацца самім. Потым, магчыма, будзе Італія...

З маляўнічых і цікавых маршрутаў па Беларусі «магаданавец» са стажам параіў экалагічную сцежку ў Нарачанскім краі. Гэта, напэўна, адна з самых прыгожых мясцін, толькі выпраўляцца ў вандроўку лепей зімой, бо летам там вырастаюць сапраўдныя «палатачныя гарады». Цікавым яшчэ можа стаць падарожжа на балота Вялікае пад Крупкамі. Аматарам некранутай прыроды варта наведаць Асіповіцкі край з яго разнастайным рэльефам і вялізнымі ляснымі масівамі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

*Ведай нашых!*

# ЭЎРЫСТЫЧНАЯ ГУТАРКА

## і ніякай трывогі за мову

**На прэстыжным Міжнародным Пушкінскім конкурсе, які праходзіў у Маскве, званні лаўрэатаў атрымалі сем выкладчыкаў рускай мовы і літаратуры з Беларусі. Усім удзельнікам (а іх было больш за дзве сотні!) прапаноўвалася напісаць сачыненне-разважанне на тэму «Вучэбная трывога. Хто і як рыхтуе настаўніка рускай мовы ў вашай краіне». Аб конкурсе і аб сваёй рабоце нам расказаў выкладчык філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Гардзей ХОМІЧ.**



***— Адкуль у назве тэмы палохаючае слова «трывога»?***

— У Беларусі, вядома, з выкладаннем рускай мовы праблем няма, бо ў нас дзве дзяржаўныя мовы. Але арганізатары конкурсу расказалі, што з года ў год атрымліваюць лісты, якія выклікаюць трывогу. Напрыклад, настаўнік фізкультуры адной з дзяржаў Цэнтральнай Азіі ў сваёй школе вымушаны весці і рускую мову, бо больш няма каму... І гэта толькі адзін прыклад. Конкурс дапамагае ўбачыць праблемы «знутры», ацаніць статус і місію педагогаў-русістаў у розных краінах.

***— Сёлета ў конкурсе ўдзельнічала рэкордная колькасць краін — 22, у тым ліку, Балівія, Аўстралія і Інданезія. Чым вам удалося здзівіць патрабавальнае журы?***

— Быў шчырым. У эсэ закрануў тэму сучасных адукацыйных тэхналогій. Напісаў пра «заходнія» метады, якія актыўна ўкараняюцца ў нас: кейс-тэхналогіі, праектнае навучанне... Яны не заўсёды дарэчы, ды і не пасуюць нашаму славянскаму менталітэту.

***— Як вы, малады выкладчык, утрымліваеце ўвагу студэнтаў?***

— Галоўнае — зацікавіць. Мой любімы прыём — эўрыстычная гутарка. Гэта класіка, метад, які прыйшоў да нас з далёкай антычнасці. Запрашаю студэнтаў да дыялогу, прымушаю іх думаць, разважаць, а не проста «праглынаць» інфармацыю. На жаль, сёння мае калегі часам злоўжываюць сучаснымі тэхналогіямі на занятках. Усё добра ў меру. А калі выкладчык усю пару проста пераключае слайды, зразумела, што карысці ад такога ўрока будзе мала.

**Хрысціна ХІЛЬКО**

SEX-БАЛЯСЫ

# ФІГУРАльны падыход

**Нават не ведаю, як пра тую навіну паведаміць... Фізрукі, трэнеры, спартсмены і проста аматары актыўнага адпачынку стрэльнуць вачыма, са здзіўленнем пацісnuць плячыма і будуць займацца ранейшым. А нехта, магчыма, радасна будзе крычаць: «А я ведаў, ведаў!..» Справа ў тым, што амерыканскія вучоныя з Ельскага ўніверсітэта ў выніку сваіх даследаванняў устанавілі: мужчыны са спартыўным целаскладам... не падабаюцца жанчынам і рана паміраюць. Ну што, здзіўленыя? У грамадстве неяк так склалася, што часцей за ўсё абмяркоўваюць праблемы магчымай залішняй вагі найперш у прадстаўніц слабай паловы чалавецтва. («Люся, дарэчы, а колькі ты важыш? — Жартуеш? Ды я лепш скажу, колькі мне гадоў!») З песні слоў, як той казаў, не выкінеш. («Цяжка быць жанчынай! Увесь час хочацца што-небудзь купіць, каго-небудзь прыбіць, пахудзець і з'есці пірожнае».)**

Многіх суцешыць тое, што гаворка і высновы вучоных датычацца мужчын ва ўзроставай групе ад 50 гадоў. («Пераглядаю «Секс у вялікі горадзе» і прыгадваю, што калі глядзела гэты серыял у першы раз, мужчына мары галоўнай герaіні Кэры падаўся мне старым страшным мужыком. А цяпер гляджу — опанькі, сімпатычны! Зразумела, што старэю».) Дык вось, па меркаванні даследчыкаў, жанчын прыцягваюць мужчыны, якія маюць невялікую лішнюю вагу, а зусім не спартыўныя, падцягнутыя прадстаўнікі моцнага полу, як заведзена было лічыць. Дамы на падсвядомым узроўні разумеюць, што менавіта паўнаватыя мужчыны лепш перадаюць гены і жывуць даўжэй. («Чаму вы не займаецеся спортам? — Разумееце, да сняданку цяжка, а пасля яго — шкодна!») Тлумачыцца ўсё тым, што для мужчын вельмі важнае натуральнае і паступовае паніжэнне ўзроўню палавых



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

гармонаў. У спартсменаў гэты працэс праходзіць неналежным чынам з-за рэгулярных усплёскаў тэстастарону. Спецыялісты лічаць, што мужчыны з невялікай лішняй вагай з-за меншага ўзроўню таго ж тэстастэрону радзей пакутуюць ад сардэчных прыступаў і раку прастаты. («Цябе не непакоіць лішняя вага? — Яна ў мяне не лішняя, а запасная».)

Пра жанчын у гэтым плане даследчыкі нічога не кажуць. Мабыць, ведаюць, што «асіная» талія звычайна мае на ўвазе наяўнасць у яе гаспадыні джала». Жыццё ж даказвае: кожны — каваль свайго шчасця. 31-гадовая аўстралійка рыхтавалася да замужжа. 165-кілаграмовая нявеста доўга падбірала адпаведны ўбор, а калі знайшла, трапіла ў бальніцу. Выйшла з яе, а ўпадабаную сукенку ўжо прадалі. Тады жанчына вырашыла ісці пад вянец... аголенай. У адной фаце, каралях і карункавай падвязцы. Паспрабавала даказаць, што «ў жанчын не бывае лішняй вагі — гэта дадатковыя месцы для пацалункаў»?

> **«Прыгажосць — сярод бягучых першых няма і адстаючых!» Я фігуральна — пра рух увогуле...**

Нядаўна ў сеціве з'явілася фатаграфія Алы Пугачовай. Асаблівую цікавасць выклікала тое, што прымадонна была апранутая ў сукенку маладзёжнай мадэлі, якая, трэба сказаць, ёй пасавала і цалкам скрывала ўзрост, выгадна падкрэсліваючы фігуру. («Жанчыны прыгажэюць да нявызначанага ўзросту, а потым маладзеюць».) Як пасля гэтага не назваць спявачку прадракальніцай, прыгадаўшы словы з яе даўняй песні: «Малады чалавек, запрасіце даму танцаваць»? («Муж гаворыць жонцы: «Калі ў наступны раз будзеш гаварыць, колькі табе гадоў, памятай, што паміж табой і старэйшым сынам павінна быць розніца хаця б у дзевяць месяцаў».) З Максімам Галкіным яна ўжо каторы год «танцуе» разам па жыцці. І, дарэчы, на тым жа здымку ўважлівыя паклоннікі Алы Барысаўны адзначылі яе ногі — як у маладой. (З адэскага гумару. «Сонечка, за сапраўдную жанчыну я табе скажу так. Сапраўдная жанчына можа нават ножкамі строіць вочкі».)

